Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

# САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

15-ты ГОД КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

ОРГАН ЦВК і СНК БССР
XIII ГОД ВЫДАНЬНЯ
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА

ПАНЯДЗЕЛАК 15 ЖНІЎНЯ 1932 г. № 180 (3559)

ТАЛЕФОНЫ:
Даказн. рэдактара 7-99
Адказн. сакратара . 4-78
Сакратароў . . . . 6-15
Начная рэдакцыя . 2-85 (два званка)
Выдавецтва . . . 2-44

УВЫПОДПІСКІ
1 месяц . . . 1 руб.
3 „ . . . 3 „
5 „ . . . 5 „
Падпіска прымаецца ўсюды, на пошце і ліста-носцамі.
Рукапісы не вяртаюцца

РЭДАКЦЫЯ І ВЫДАВЕЦТВА
МЕНСК, ПЛЯЦ ВОЛІ, 17.

КОШТ АБ'ЯВЫ 1 экзэмпляр 1 руб
КОШТ ПУБЛІКАЦЫІ аб згубе 1 дакумэнту—2р.

## Сеньня у нумары

АРТЫКУЛЫ—ПЕРАДАВЫ. Больш сілосу для сацыялістычнай жывёлагадоўлі.
Хімізацыя народнай гаспадаркі ў другой пяцігодцы (2 стар.).
РЫФ. Сучаснае становішча ў Германіі і антыфашысцкая кампанія КПГ (3 стар.).
ЛІСТЫ СЕЛЬКОРАЎ (3 стар.).
Пуцёўка сэсіі павінна быць прынята. З 22-га жніўня пачынаем справаздачы гарсаветаў (2 стар.).
ЗА 1.200.000 ТОН СІЛОСУ
На зіму жывёле—сытны кармавы рацыён (1 стар.).
ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА
Кіраваць канкрэтна і апэрацыйна ўсімі вучасткамі калгаснай вытворчасьці (1 стар.).
СЬЦЯГ ЦВК БССР АТРЫМЛІВАЕ ЛЕПШАЕ ДЭПО (3 стар.).
ПАЗЫКУ 4-га ЗАВЯРШАЮЧАГА Ў МАСЫ (3 стар.)
Усебеларускі конкурс на лепшую падрыхтоўку да навучальнага году (4 стар)
ЗА ГРАНІЦАЙ (4 стар.).

# БОЛЬШ СІЛОСУ ДЛЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ЖЫВЕЛАГАДОЎЛІ

Праблема жывёлагадоўлі на даным этапе разьвіцьця пастаўлена партыяй, як адна з цэнтральных задач у сельскай гаспадарцы. У ажыцьцяўленьні гэтай задачы БССР займае не апошняе месца сярод іншых рэспублік Саюзу. За апошнія гады мы дамагліся буйнейшых дасягненьняў у справе вырашэньня жывёлагадоўчай праблемы. Гэтыя посьпехі сталі магчымы толькі з прычыны разгортваньня будаўніцтва саўгасаў і калгасаў, абапіраючыся на шпаркі рост сацыялістычнай прамысловасьці, з прычыны няпрымірымай барацьбы з клясавым ворагам—кулаком, і яго агентамі.

Апошнія рашэньні партыі і ўраду аб жывёлагадоўлі і разгортваньні саўгасна-калгаснага гандлю яшчэ больш садзейнічаюць, больш паскараюць разьвіцьцё як аграмаджанай, так і неаграмаджанай жывёлагадоўлі. Гэтая рэчаіснасьць ужо даведзена практыкай разгортваньня саўгасна-калгаснага гандлю.

Але трэба памятаць, што далейшае разьвіцьцё сацыялістычнай жывёлагадоўлі і падвышэньне яе прадукцыйнасьці залежаць у першую чаргу ад вырашэньня кармовай праблемы. Кармы—гэта аснова сацыялістычнай жывёлагадоўлі, аснова яе прадукцыйнасьці. Без падвядзеньня кармовай базы ня можа быць росту стада, ня можа падвысіцца выхад таварнай прадукцыі. Вось чаму партыя і ўрад у сваіх рашэньнях, падкрэсьліваючы гэту акалічнасьць асабліва настойліва патрабуюць ад гаспадарчых арганізацый ні ў якім разе не паслабляць увагі да пытаньня кармоў.

Сярод кармоў, поруч з грубымі і іншымі кармамі, за апошнія 2-3 гады пачэснае месца заняў сілос. Сілос выклікаў цэлую сапраўдную рэвалюцыю ў жывёлагадоўлі. Патрабаваўся параўнаўча кароткі час—усяго 2—3 гады ўпартай барацьбы за гэты каштоўнейшы і сакавіты корм, і ён даў бліскучыя вынікі. Карысьць сілосу даведзена на справе—даведзена практыкай саўгасаў і калгасаў. Вынікі сіласаваньня кармоў ушчэнт разьбілі кулацкую контр-рэвалюцыйную «тэорыю» аб шкоднасьці сілосу для жывёлы. У сёлетнюю зіму сілос пазбавіў ад бяскормицы, падзяжу не адну сотню галоў жывёлы. Вось чаму рад саўгасаў, калгасаў і паўат раёнаў пабаявому разгортваюць сіласаваньне кармоў.

Аднак, гэта не дае ніякіх падстаў рабіць хоць малейшае паслабленьне ўвагі сілоснай кампаніі. Рост стада сацыялістычнай жывёлагадоўлі патрабуе адначасова і пашырэньня кармовага балянсу. А між тым, матар'ялы з месц гавораць нам, што такога роду тэндэнцыя, тэндэнцыя адмаўленьня ад апэрацыйнага кіраўніцтва сіласаваньнем кармоў у радзе раёнаў назіраецца. Знаходзяцца «тэарэтыкі», якія пачынаюць сьцьвярджаць, што сілос больш ня мае патрэбы ў агітацыі і прапагандзе. Адсюль, за гэтай «тэорыяй» сьледуе практыка апартуністычнага самацёку, у выніку якога маем адсутнасьць усякага кіраўніцтва па разгортваньні сіласаваньня кармоў. З гэтымі праявамі трэба весьці самую рашучую барацьбу.

Паводле пляну ў 1932 годзе па БССР павінна быць закладзена ня менш 1.200 тыс. тон сілосу. Гэта праграма цалкам рэальна, яе можна і неабходна ня толькі выканаць, але і перавыканаць. Посьпяховае выкананьне пляну сіласаваньня тым больш магчыма, што здабываньне гэтага віду корму не абумоўлена кліматычнымі ўмовамі. Сілос можна закладаць у любы час—ад раньняй вясны і да позьняй восені. Выходзячы з пэрыядаў ўборкі сілосных культур і збору дзікарослых расьлін, НКЗ устаноўлены кантрольныя месячныя заданьні па сіласаваньні кармоў. Так, у чэрвені павінна быць закладзена ня менш 3 проц. гадавога пляну, у ліпені—12 проц., у жніўні—35 проц., верасьні—40 проц. і кастрычніку—10 проц.

З гэтага бачна, што мы шчыльна падыйшлі да рашаючых баёў за сілос. Жнівень і верасень павінны даць нам ня менш 90 проц. гадавога пляну. Адсюль задача—**узьняць тэмпы сіласаваньня.**

Зводка НКЗ гаворыць аб яўным невыкананьні кантрольнага заданьня за першыя два з паловай месяцы. На 10 жніўня плян па сіласаваньні выкананы толькі на 2,3 проц., прычым у саўгасах на 3,5 проц., у калгасах—на 2,4 проц. і аднаасобных гаспадарках—на 0,3 проц.. Рад раёнаў, (Крупскі—0,6 проц., Сураскі—0,4 проц. Дубровенскі—0,2 проц., Хойніцкі—1,3 проц.) яўна зрываюць сіласаваньне.

ЦК КП(б)Б і СНК БССР у апошняй сваёй пастанове, даючы крытычны аналіз разгортваньня сіласаваньня кармоў па рэспубліцы, у першую чаргу патрабуюць ад адстаючых раёнаў удзесяцярыць тэмпы, дамагчыся рашучага пералому. ЦК і СНК папярэджваюць усе райкомы, гаркомы, райвыканкомы, саўгастрэсты, дырэктароў МТС і саўгасаў, што «невыкананьне пляну сіласаваньня кармоў і сілоснага будаўніцтва будзе разглядацца, як апартуністычная недаацэнка і нежаданьне змагацца за выкананьне пастаўленых партыяй і ўрадам задач па разьвіцьці жывёлагадоўлі і павышэньні яе прадукцыі».

У чым прычына павольных тэмпаў у сіласаваньні кармоў? Прычына—у не даацэнцы радам зьвеньняў усёй важнасьці гэтай кампаніі, у стаўцы на самацёк, у адсутнасьці апэрацыйнага кіраўніцтва, у наяўнасьці абязьлічкі, адсутнасьці кантролю выкананьня. Нарэшце, прычына—у няўмелым спалучэньні ўборачнай з сіласаваньнем.

Пара раскачацца і па-сапраўднаму ўзяцца за справу сіласаваньня. Трэба ва што-б там ні стала закласьці ў жніўні ня менш 600 тыс. тон сілосу.

Вядучы рашучую барацьбу з практыкай і «тэорыяй» апартуністычнага самацёку, партарганізацыі і сельсаветы павінны забясьпечыць бальшавіцкім кіраўніцтвам сілосную кампанію. Ня толькі неабходна прапагандаваць сілос, а за гэты корм трэба біцца з усёй бальшавіцкай рашучасьцю. «Цэнтральны камітэт партыі і СНК БССР абавязваюць кожную партыйную і камсамольскую ячэйку, кожнага члена КП(б)Б і ЛКСМБ, дырэктара МТС і саўгасаў намагчы ўсе сілы, бальшавіцкую волю і настойлівасьць на выкананьне пляну сіласаваньня кармоў».

Посьпехі сіласаваньня будуць залежаць ад таго, наколькі правільна будзе арганізавана праца, укаранена зьдзельшчына, выкарчавана абязьлічка. Іменна там, дзе правільна пастаўлена справа з арганізацыяй працы, дзе і карэньняў не засталося ад абязьлічкі,—там мы маем бліскучыя посьпехі сіласаваньня кармоў. Тут рашаючую ролю адыгрывае і павінна адыграць калгасная вытворчая брыгада. Задача партыйных і камсамольскіх ячэек скан цэнтраваць усю ўвагу на рабоце брыгад, на арганізацыі працы ўнутры іх. Цэнтр усёй работы партыйных і камсамольскіх ячэек і сельсаветаў у разгортваньні сілоснай кампаніі павінен быць перанесены непасрэдна ў брыгады. Апэрацыйна кіраваць—гэта значыць, перш за ўсё прысьці ў калгас, брыгаду, дапамагчы там наладжаньню работы. Трэба цьвёрда памятаць, што за ход сіласаваньня ў калгасах адказваюць перад ячэйкай члены партыі і камсамольцы, якія непасрэдна прымаюць і павінны прымаць удзел у сіласаваньні кармоў.

Надыйшоў самы адказны рашучы пэрыяд сіласаваньня. Закладку сілосу неабходна праводзіць удзесяцярённымі тэмпамі. Для выкананьня гэтай задачы ў нас у наяўнасьці ўсе магчымасьці. Апрача сілосных культур мы маем невычарпальныя багацьці зялёнай дзікарослай масы ў кожнай гаспадарцы, якую можна скарыстаць на сілос зараз, асабліва ў жніўні.

Пустазельле, асака, чарот, аер, лісьце з дрэў, парасьць—вось невычарпальныя крыніцы зялёнай масы, якая можа даць сотні тон добраякаснага сілосу.

Трэба весьці самую рашучую барацьбу з апартуністычнай стаўкай на чарговасьць кампаній, з адцяваньнем сіласаваньня кармоў на асенні пэрыяд, з абязьлічэньнем гэтай справы. Трэба ўмела спалучаць уборку яравых, сяўбу азімых з сіласаваньнем, арганізаваць справу так, каб усе сельска гаспадарчыя работы праводзіліся адначасова; трэба зараз-жа ачысьціць ямы, вежы, траншэі, скончыць будаўніцтва новых установак. За сіласаваньне кармоў у саўгасе і калгасе павінна адказваць пэўная група рабочых, пэўная калгасная брыгада, або група калгасьнікаў. Выключная роля ў справе сіласаваньня кармоў усклада ецца на МТС. МТС у першую чаргу павінны стаць у авангардзе гэтай кампаніі. Трэба зараз-жа максымальна нарыціць мэханічную сілу—трактары, сіласарэзку.

Барацьба за сілос—гэта барацьба за сацыялістычную жывёлагадоўлю, за дадатковыя сотні тысяч цэнтнераў прадукцыі, якую саўгасы, калгасы, калгасьнікі, беднякі і сераднякі-аднаасобнікі могуць вывесьці на савецкі рынак.

## Ставім у прыклад калгасы Судзілаўскага сельсавету

КЛІМАВІЧЫ. (Наш. кар.). Калгасы Судзілаўскага сельсавету па-бальшавіцку змагаюцца за стварэньне моцнай кармовай базы. Сіласаваньне кармоў тут пачалі праводзіць з пачатку лета, не адкладваючы гэтае работы на восень, калі ўся трава ўжо гіне.

Добра справіўся з правядзеньнем гэтай работы калгас «ЎДАРНІК», які выкарыстаў на сілос усё пустазельле з гародаў. З пачатку лета калгас прывёў у парадак ямы і траншэі і паступова запаўняе іх зялёнай масай. У выніку ўдарна праведзенай работы калгас «Ударнік» з 200.т., паводле гадавога пляну, на 1 жніўня ўжо засіласаваў 180 тон. Сіласаваньне кармоў працягваецца. Калгасьнікі абяцаюць перавыканаць плян сіласаваньня.

Не адстаюць ад калгасу «Ударнік» і іншыя калгасы Судзілаўскага сельсавету. Не чакаючы, калі пасьпеюць сілосныя культуры, калгасы гэтага сельсавету прыступілі да сіласаваньня путазельля і асакі. Уся трава ад праполкі лёну і гародаў пайшла ў ямы і траншэі. Калгасьнікі маюць намер поўнасьцю засіласаваць увесь бульбоўнік, гароднае пацінье, а пры нясприяючым надвор'і і атаву травы.

Гэтых посьпехаў у галіне барацьбы за стварэньне моцнай кармовай базы, калгасы Судзілаўскага сельсавету дамагліся дзякуючы штодзённаму кіраўніцтву з боку парт'ячэйкі і сельсавету.

Як трэба змагацца за сілос, усе адстаючыя калгасы Клімаўшчыны павінны вучыцца ў калгасьнікаў Судзілаўскага сельсавету.

Рэйд газэт «Савецкая Беларусь», «Камуна», РКК-РСІ:
П. КАВАЛЁЎ
А. КУЛАКОЎСКІ
П. БУРАВЕЙ
МАСКАЛЁЎ
П. БУЙНЫ

ЗА 1.200.000 ТОН СІЛОСУ

# На зіму жывёле—сытны кармовы рацыён

### Сіласаваньне кармоў патрабуе штодзеннага апэрацыйнага кіраўніцтва

## Даныя НКЗ аб сіласаваньні кармоў на 10 жніўня 1932 г.

| | Сілоснае будаўн. (у куб. мэтр.) Плян | Выкан. | Проц. | Сіласав. кармоў (у тонах). Плян | Выкан. | Проц. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Саўгасы | 333350 | 52356 | 15,7 | 200000 | 6920 | 3,5 |
| Калгасы | 1500000 | 309776 | 20,7 | 900000 | 21797 | 2,4 |
| Аднаасобнікі | 166670 | 2366 | 1,4 | 100000 | 284 | 0,3 |
| Усяго па БССР | 2000000 | 364498 | 18,2 | 1200000 | 29001 | 2,3 |

**1.200.000 тон сілосу для сацыялістычнай жывёлагадоўлі БССР—вось праграма, якая высунута сёлета партыяй і ўрадам. Сіласаваньне ў гэтым годзе павінна праводзіцца на працягу ўсяго лета і восені, пачынаючы з чэрвеня і канчаючы кастрычнікам. Прычым, паводле кантрольных тэрмінаў, устаноўленых партыяй і ўрадам, мы павінны засіласаваць у чэрвені 3 проц. гадавога пляну, у ліпені—12 проц., жніўні—35% верасьні—40 % кастрычніку—10 %.**

**Такім чынам, як бачым з кантрольных тэрмінаў, рашаючымі месяцамі па сіласаваньні кармоў зьяўляюцца жнівень і верасень. Іменна гэты час зьяўляецца асноўным «сэзонам» збору на сілос добраякаснай зялёнай масы, бо чым пазьней, тым больш зялёнага трацінь сваю спажыўную вартасьць.**

**Між тым, як відаць з даных зводкі, тэмпы сіласаваньня кармоў па рэспубліцы яўна нездавальняючыя. На 10-е жніўня гадавы плян выкананы на 2,3 проц.. Гэткія тэмпы недапушчальны тым больш, што нават у мінулым годзе на 10-е жніўня мы мелі 2,7 проц., пры гадавой праграме ў 1 млн. тон.**

**У ліпені мы павінны былі мець закладзенага сілосу ня менш 15 проц. гадавога пляну, а заклалі толькі 1,5 проц.; ліпеньскі плян недавыкананы на 13,5 проц.**

**Адсюль недавыкананьне чэрвеньскага і ліпеньскага заданьняў мы павінны ў абавязковым парадку перакрыць перавыкананьнем жнівеньскага заданьня. Задача партыйных і савецкіх органаў на месцах—рашучым чынам узьняць уверх крывую сіласаваньня, дамагчыся таго, каб у жніўні засіласаваць ня менш 50 проц. гадавога пляну. У нашых руках ёсьць усе магчымасьці дабіцца гэтага. Плян па сіласаваньні бязумоўна рэальны, яго можна і неабходна выканаць.**

**Там, дзе да справы сіласаваньня аднесьліся з усёй бальшавіцкай сур'ёзнасьцю—там мы маем бліскучыя паказьнікі ў гэтай справе.**

### Па-бальшавіцку змагаюцца за сілос

**1) Мсьціслаўскі раён, які выканаў гадавы плян на 20 проц., 2) Асьвейскі—12,7 проц.; значныя зрухі маюць—Дрысенскі раён—10 проц., Кіраўскі—10,8 проц., Ельскі 10,4 проц. і Камарынскі 10,7 проц.**

### ЗРЫВАЮЦЬ СІЛАСАВАНЬНЕ

**1) Крупскі раён, які выканаў гадавы плян на 0,6 проц., 2) Сураскі—0,4 проц., 3) Дубровенскі—0,2 проц., 4) Дзяржынскі—0,2 проц., 5) Заслаўскі—0,5 проц., 6) Хойніцкі—1,3 проц.**

**У апошняй сваёй пастанове ЦК КП(б)Б і СНК БССР «папярэджваюць усе райкомы, гаркомы, райвыканкомы, саўгастрэсты, дырэктароў МТС і саўгасаў, што невыкананьне пляну сіласаваньня кармоў і сілоснага будаўніцтва будзе разглядацца, як апартуністычная недаацэнка і нежаданьне змагацца за выкананьне пастаўленых партыяй і ўрадам задач па разьвіцьці жывёлагадоўлі і павышэньні яе прадукцыйнасьці».**

## Запоўніць сілосам ямы, траншэі, вежы

### (Паводле матар'ялаў нашых рабселькораў)

**ВОРША.** Паводле пляну Аршанскі раён павінен сёлета засіласаваць 29733 тон зялёных кармоў, з якіх 21920 тон у калгасах і 7813 у саўгасах. Аднак, ня гледзячы на значны плян сіласаваньня, гэтая кампанія ў раёне да апошняга часу належна не разгарнулася.

Рад сельсаветаў апартуністычна адносіцца да сіласаваньня кармоў. Калгасы **Якаўлевіцкага** сельсавету і частка калгасаў **Малатчынскага** сельсавету нічога ня робяць як у галіне сіласаваньня кармоў так і ў справе рамонту і будаўніцтва сілосных установак. У калгасе **«Барэц»**, Малатчынскага сельсавету з мінулага году пустае сілосная яма. Яма абвалілася, але яе ніхто не рамонтуе. Старшыня калгасу **Жданові**ч зьбіраецца сіласаваць траву ўвосень пасьля таго, як будзе скончана ўборка сена і збожжа, г. зн. калі ўжо ня будзе чаго сіласаваць.

Значная частка сельсаветаў і партыйных ячэек не мабілізавалі ўвагу калгасьнікаў на выкананьне пляну сіласаваньня кармоў. Раённыя арганізацыі не наладзілі апэрацыйнае кіраўніцтва ходам сіласаваньня. Райзэ, Райкалгасаюз і МТС нічога ня ведаюць што робіцца ў гэтай галіне па калгасах. У выніку самацёку чэрвеньскі і ліпеньскі пляны сіласаваньня сарваны.

Плян сіласаваньня па Аршаншчыне знаходзіцца пад пагрозай зрыву. Гэтага нельга дапусьціць. Трэба дабіцца, каб сацыялістычная жывёлагадоўля была забясьпечана моцнай кармовай базай, трэба зараз разгарнуць ударную работу, каб перакрыць нявыкананьне пляны па сіласаваньні ў чэрвені і ліпені.

Праўленьне калгасу «Ударнік», Вендараскага сельсавету, Магілёўскага раёну ня думае прыступаць да сіласаваньня кармоў. У мінулую зіму калгасная жывёла пацярпела ад бяскормицы ў выніку таго, што плян сіласаваньня быў значна недавыкананы. Але памылкі мінулага году нічаму не навучылі праўленьне калгасу, і сёлета нічога ня робіцца, каб пачаць сіласаваньне кармоў. Сілосная яма не адрамантавана, яна заплыла вадой.

Камсамольская ячэйка калгасу зусім ня цікавіцца тым, што сіласаваньне кармоў зрываецца.

КАЛГАСНЫ

## ЗАГАД № 150
### Рэвваенсавету СССР

*10 жніўня 1932 году. Гор. Масква*

*1. Прызваць на сапраўдную вайсковую службу ў Рабоча-Сялянскую Чырвоную Армію ў пэрыяд з 1 верасьня па 1 лістапада г. г. грамадзян, якія нарадзіліся ў 1910 годзе і ўзростаў, якім сышлі адтэрміноўкі прызыву.*

*Дакладныя тэрміны прызыву ўстанавіць рэволюцыйным вайсковым саветам округ.*

*Грамадзян нараджэньня 1902 году, якія раней карысталіся адтэрміноўкамі, ад прызыву аслабаніць і перавесьці ў запас 1 чаргі.*

*ПАДСТАВА: арт. 131 закону аб абавязковай вайсковай службе.*

*Нарком па вайсковых і марскіх справах*
*і старшыня РВС СССР ВАРАШЫЛАЎ*

## ЗАГАД № 151
### Рэвваенсавету СССР

*10 жніўня 1932 г. Горад Масква.*

*1. Зволіць з радоў Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі ў доўгатэрміновы водпуск радавых і малодшы начсклад тэрміновай службы:*

*а) з часьцей з 2-х гадовым тэрмінам службы прызыву 1930 г.;*
*б) з часьцей з 3-х гадовым тэрмінам службы прызыву 1929 г.;*
*в) з часьцей з 4-х гадовым тэрмінам службы прызыву 1928 г.;*
*г) вайскова-пройзводственьнікаў прызыву 1930 г.*

*2. Звальненьне правесьці*

*а) з сухапутных, паветраных і марскіх сіл у пэрыяд з 25 верасьня па 15 сьнежня г.г.;*
*б) з канвойных войск СССР да 15 сьнежня г. г.;*
*в) з унутраных войск АДПУ да 15 студзеня 1933 г.*
*г) з пагранічнай аховы да 1 красавіка 1933 г.*

*3. Пераменны радавы і малодшы начсклад тэрыторыянальных часьцей прызыву 1927 г. зволіць у запас РСЧА.*

*Звальненьне правесьці па сканчэньні зборaў тэрыторыянальных часьцей.*

*Загад абвясьціць ва ўсіх ротах, эскадронах, батарэях, камандах, атрадах і легіёнах, суднах і экіпажах*

*ПАСТАНОВА: арт. 40 закону аб абавязковай вайсковай службе.*

*Чарком. па вайсковых і марскіх справах і*
*старшыня РВС СССР ВАРАШЫЛАЎ.*

## УСІМ САКРАТАРОМ РК КП(б)Б

**Ня гледзячы на пасьпяваньне ільну і спрыяючыя ўмовы надвор'я, ход пераробленьня ільну зусім нездавальняючы. ЦК асабліва адзначае адставаньне ўборкі па Сіроцінскім, Дрысенскім, Гарадоцкім Сураскім і Дубровенскім раёнах.**

**ЦК указвае, што кожны дзень спазьненьня з уборкай ільну павялічвае страты, зьніжае якасьць валакна.**

**ЦК абавязвае райкомы: забясьпечыць уборку ільну раньняй жоўтай сьпеласьці, поўнасьцю скарыстаць машыны Гільнтэйна і Эдзі. Скончыць будаўніцтва мачыльных ям, прыстасаваньне пунктаў пераапрацоўкі да 20 жніўня, ліквідаваўшы разрыў паміж цераблеьнем і наступнымі працэсамі апрацоўкі.**

**Мабілізуйце актыў раёну на ліквідацыю наяўных прарываў праз масавую работу, арганізацыю працы, арганізацыю сацыялістычнай узаемадапамогі і ліквідуйце адставаньне паасобных калгасаў.**

**Устанавіце штодзённую інфармацыю калгасаў, саўгасаў у райком і забясьпечце прадстаўленьне апэрацыйных зводак Наркамзему.**

**Сакратар ЦК КП(б)Б ШАРАНГОВІЧ**
**Наркамзем МАСЮКОЎ**

Партыйнае будаўніцтва

# КІРАВАЦЬ КАНКРЭТНА, АПЭРАЦЫЙНА

### УСІМІ ВУЧАСТКАМІ КАЛГАСНАЙ ВЫТВОРЧАСЬЦІ

## Раўняцца па парт'ячэйцы Халопеніцкага саўгасу

Парт'ячэйкі **Ўзнацкая, Хацюкоўская, Ігрушацкая, Нацкая і Жабярыцкая** да гэтага часу не распрацавалі рашэньні ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б, не гаворачы ўжо аб іх рэалізацыі. Гэтыя пяць партячэек ня маюць арганізацыйна-масавай і палітыка-выхаваўчай работы сярод калгасьнікаў і беднякоў серадняку-аднаасобнікаў не вядуць. Калі запытаць любога члена партыі,—«калі ў вас быў партсход?»—дык ён на гэта не адкажа, бо ня памятуе ўжо калі быў апошні сход...

Партвучобай таксама ніводная з гэтых пяці ячэек не займалася. Не вядзецца работа з камсамолам. З-за адсутнасьці парткіраўніцтва некаторыя камсамольскія ячэйкі разбурыліся. Уборка па сельсаветах, якія абслугоўваюцца пералічанымі парт'ячэйкамі, праходзіць павольнымі тэмпамі. Не разгорнута барацьба са стратамі.

Гэта тлумачыцца тым, што члены партыі не расстаўлены па брыгадах і ніякай растлумачальнай работы ў калгасах не праводзіцца. Адсутнасьць усякай масавай работы ў калгасах, у брыгадах скарыстоўвае клясавы вораг у сваіх інтарэсах. Ён рознымі мэтадамі праводзіць сваю шкодную работу па зрыву калгаснага будаўніцтва. Нічога ня зроблена па растлумачэньні пастаноў партыі і ўраду аб разгортваньні калгаснага гандлю. У большасьці калгасаў аб гэтых пастановах амаль ня ведаюць.

Далей такога становішча трываць нельга. РК КП(б)Б павінен зараз-жа праверыць работу гэтых ячэек і дапамагчы ім наладзіць партыйна-масавую работу.

Зусім іншае становішча ў тых парт'ячэйках, дзе пастановы ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б прапрацаваны і праводзяцца ў жыцьцё. **Халопеніцкая саўгасная парт'ячэйка прапрацоўку пастаноў ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б увязвае з практычнай перабудовай партыйна-масавай работы.** Усе партыйцы раўна мерна расстаўлены па брыгадах, цэхах і г. д. Так, у паляводчым цэху—адзін член партыі і 4 кандыдаты, у сьвінагадоўчым цэху—адзін камуніст і 4 кандыдаты, у жывёлагадоўчым цэху—адзін камуніст. Трыкутнік саўгасу так сама добра арганізаваў сваю работу.

Такая расстаноўка партыйных сіл дала магчымасьць саўгасу па-бальшавіцку выканаць усе сельска-гаспадарчыя работы. Кожны член партыі і кандыдат мае адпаведную нагрузку. Парт'ячэйка паставіла сваёй задачай давесьці да кожнага рабочага саўгасу пастанову ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б і апошнія пастановы ўраду шляхам прапрацоўкі іх у кожнай брыгадзе ў час адпачынку і абедзеных перапынкаў. У выніку такой работы ёсьць ужо рад дасягненьняў.

Веснавая сяўба ў саўгасе прайшла па-бальшавіцку, брыгады перавыконвалі нормы выпрацоўкі. Свачасова была праведзена падрыхтоўка да ўборачнай, а таму зараз уборка ўжо канчаецца. Сенаўборка праведзена таксама свячасова. Ужо засіласавана 90 тон зялёнай масы.

**Па партячэйцы саўгасу «Халопеніч» павінны раўняцца ўсе парт'ячэйкі раёну.**

Пятрок Ліпнёў.

## У ПАЛАСЕ ГЛЫБОКІХ ПРАРЫВАЎ

### Чаму ў Талочыне ў калгасах ёсьць адсеў

**Талочын (ад нашай выяздной рэдакцыі)**

Аболіцкі сельсавет, Талачынскага раёну, знаходзіцца ў 25 кілёмэтрах ад раённага цэнтру. Партячэйка, якая знаходзіцца пры сельсавеце, складаецца з 5 членаў партыі і 2 кандыдатаў.

Тая акалічнасьць, што сельсавет знаходзіцца далёка ад раённага цэнтру, што на яго тэрыторыі налічвалася да 14 калгасаў і што партыйная ячэйка вельмі малалікавая і ўсе члены **ныя пратыі маладыя, (з 1930 і 1931 году ў партыі) патрабавала і патрабуе ад** райкому КП(б)Б і РВК канкрэтнага апэрацыйнага кіраўніцтва і ўсямернай дапамогі ў рабоце.

Але пры азнаямленьні з работай ячэйкі і сельсавету яшчэ раз пераконваемся, як дрэнна мінулы склад Талачынскага РК КП(б)Б кіраваў і дапамагаў рабоце партячэек, яшчэ раз пераконваемся, што мінулы склад РК і РВК па сутнасьці ня ведалі становішча ў сельсавеце, інакш нельга было-б давясьці да такога заняпаду усю работу.

Да пачатку веснавой сяўбы ў Аболіцкім сельсавеце было 14 калгасаў. Сельсавет быў калектывізаваны на 80 проц. У час веснавой сяўбы і перад самай уборачнай кампаніяй частка калгасаў развалілася, а ў астатніх, за выключэньнем калгасу «Свабода», быў значны адліў.

Знайсьці прычыны развалу калгасаў вельмі лёгка. Вазьмеце толькі некалькі калгасаў. Бярэце, напрыклад, такія калгасы, як «Пралетары», Чырвоная Вобаль», былы калгас «Пуцілавец», «Чырвоны шлях» і нават самы моцны і буйнейшы калгас «Свабода» і вы знойдзеце яскравы прыклад, таго, як нельга будаваць калгасы, яскравы прыклад грубага скажэньня дырэктыў партыі аб калгасным будаўніцтве.

Пагоня за колькасьцю калгасаў і калгасьнікаў і «лявацкае» адміністраваньне—вось асноўныя мэтады калектывізацыі ў Аболіцкім сельсавеце. Ячэйка пашла па шляху насаджэньня маленькіх, «карлікавых» калгасаў з 5—7—10 гаспадарак. У радыусе ад аднаго да трох кілёмэтраў, дзе разьмешчаны 2—3 маленькіх пасёлачкі, арганізавана тры калгасы і кожны з іх складаецца з 7—8 і ня больш 13 гаспадарак.

Пры гэтым трэба падкрэсьліць, што ва ўсе калгасы прымалі без разбору, бралі ўсіх «хто хацеў улівацца». Ва ўсіх без выключэньня калгасах, а ў многіх нават на чале кіраўніцтва, была значная частка кулакоў, вельмі многа гаспадарак з цьвёрдымі заданьнямі.

Дадайце сюды, што партыйная ячэйка і сельсавет, арганізаваўшы такія калгасы, не заняліся арганізацыяй працы ў гэтых калгасах і іх гаспадарчым умацаваньні, што партыйная ячэйка наогул не праводзіла ніякай партыйна-выхаваўчай работы з адсталай часткай калгасьнікаў і ня бачыла раз бураючай работы ў калгасах кулацкіх элемэнтаў—і вам будзе зусім зразумелай прычына развалу гэтых калгасаў.

Пару слоў аб калгасе «Свабода». Калгас «Свабода» — інтэрнацыянальны калгас і самы буйнейшы на тэрыторыі сельсавету, ён складаецца з 60 гаспадарак. Гэты калгас павінен быў-бы быць вядучым у адносінах да астатніх калгасаў. Аднак і гэты калгас такім далёка не зьяўляецца, бо партыйная ячэйка зусім слаба кіруе яго работай.

З кіраўніцтвам уборачнай кампаніяй партыйная ячэйка і сельсавет не справіліся. На сёнешні дзень у калгасах «Чырвоны шлях», «Пралетары» і інш. не ўбрана шмат жыта. Ячэйка не ўзначаліла барацьбы са стратамі сацыялістычнага ўраджаю.

На 10-га жніўня нават у калгасе «Свабода» было ня скошана 60 га сенажаці і ня зжата 15 га жыта. Кіраўніцтва калгасу сьцьвярджае, што аб сталых вытворчых брыгадах ня можа быць гутарак. Партыйная ячэйка да самых апошніх дзён абсалютна нічога не рабіла для таго, каб у бліжэйшыя дні скончыць уборку жыта і сенажаці. Трэба наогул падкрэсьліць, што ячэйка не праяўляе ніякай жыцьцяздольнасьці і ніякай апэрацыйнасьці ў сваёй рабоце, таму і правальвае рад важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній.

На апошнім агульным сходзе партыйнай ячэйкі высьвятлілася што з такім невялічкім партыйным калектыве, як 6 чалавек, існуе незработанасьць, звады паміж асобных членаў партыі. Асобныя партыйцы не адчуваюць ніякай адказнасьці за работу прымацаваных да іх вучасткаў і калгасаў, а некаторыя зрасьліся з кулацкім элемэнтам. Напрыклад, член партыі Казакевіч—загадчык школы, абсалютна нічога не зрабіў для таго, каб папярэдзіць развал калгасу «Чырвоная Вобаль». Сакратар ячэйкі тав. Лядуховская ня можа ахапіць усёй работы, а больш моцныя члены партыі, якія ёсьць у ячэйцы, ня толькі не дапамагаюць ёй, але нават ігнаруюць яе. І ня дзіва, што ячэйка не спраўляецца з кіраўніцтвам сельсаветам і калгасамі.

Шлях, па якім партыйная ячэйка павінна ісьці да аздараўленьня сваёй работы і замацаваньня калгасаў—гэта перш за ўсё шлях ліквідацыі непаладкаў, шлях большай згрупаванасьці ўнутры самой партыйнай ячэйкі і перанясеньня цэнтру работы ячэйкі ў калгасы, непасрэдна ў поле. Ва ўсёй сваёй рабоце ячэйка павінна абапірацца на калгас «Свабода», які можа і павінен стаць апорным і вядучым калгасам у сельсавеце. Абапіраючыся на гэты калгас, ячэйка павінна скан цэнтраваць усе сілы на сканчэньне ўборкі ў бліжэйшыя дні і на арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне астатніх калгасаў. Для гэтага трэба стаць на шлях выкрыстаньня лепшых калгасьнікаў, якія ёсьць у калгасе «Свабода».

Аднак, партыйная ячэйка толькі сваімі сіламі наўрад ці справіцца з выпраўленьнем тых буйных памылак «лявацкага» адміністраваньня і ўсіх тых прарываў, якія ёсьць у рабоце партыйнай ячэйкі і сельскага савету. Талачынскі райком КП(б)Б павінен аказаць канкрэтную дапамогу партыйнай ячэйцы ў рабоце па замацаваньні калгасаў, па правядзеньні ўборачнай кампаніі і падрыхтоўкі да асеньняй сяўбы

Л. Ніхамкін.

## Апэрацыйнае кіраўніцтва забясьпечыла посьпех

**КЛІЧАЎ.** Нясецкая партыйная ячэйка добра, апэрацыйна кіравала ўборачнай кампаніяй, а таму першым у раёне скончыў уборку Нясецкі сельскі савет. Да 4-га жніўня былі поўнасьцю ўбраны і сенажаць, і жыта, і ячмень,—усяго 1227 гектараў. Ёсьць у сельсавеце такія калгасы, якія паказалі яшчэ больш бліскучыя прыклады бальшавіцкай работы. Так, калгас **«Сьветлы шлях»** поўнасьцю скончыў уборку сенажаці, вікі, жыта і ячменю яшчэ 25 ліпеня.

Уся работа ў калгасе «Сьветлы шлях» праводзілася мэтадамі сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. Спаборнічалі на лепшае і хутчэйшае правядзеньне ўборкі брыгады на чале з брыгадзірамі тав. **Рудым А. і Славінскай К.** За ўвесь час уборачнай як у аднэй, так і ў другой брыгадзе ня было ніводнага прагулу ці спазьненьня на работу.

Добра быў

# Бедната засталася без сенажаці

(Ліст селькора)

Рагачэўскі гарсавет зусім няправільна размеркаваў сенажаць. Гэтым разьмеркаваньнем засталася неадаволена ўся бедната, якая мае жывёлу і не атрымала сенажаці. Далі сенажаць каму ня трэба было. Прыкладна: бальніца атрымала на аднаго каня 8 га (каля паўтары тысячы пудоў). Добкін—служачы РВК, атрымаў сенажаці па ордэры РВК і зараз-жа прадаў гэта сена на базары. Крамнік Кларка № 12 Рубанчык атрымаў сенажаць і перадаў свайму цясьцю.

Далі сенажаць грамадзянам Сырыцу і Кітаіна, якія зусім ня маюць жывёлы. Вайскова-служачыя атрымаўшы сенажаць зараз-жа прадалі яе грамадзянцы Алелявай, а тая у сваю чаргу перапрадала грамадзянину в. Каласы Кар паву. Атрымаў сенажаць як квартальны і былы лішэнец. Грамадзянін Расін жывёлы зусім ня мае, а яму далі каза лак сенажаці на 200 пудоў.

Як бачна з гэтых фактаў, сенажаць у большасьці атрымалі тыя, каму яна непатрэбна і зараз-жа пачалі спэкуляваць сенам, а тая беднота, якой сапраўды патрэбна сенажаць і у якой ёсьць жывёла, засталася бяз сенажаці.

Такія разьмеркавацелі сенажаці, на вачох у людзей скрывіўшы клясавую лінію, павінны быць прыцягнуты да суровай адказнасьці.

ЯША.

Ад рэдакцыі: Рэдакцыя просіць Рагачэўскага раённага пракурора высьвятліць гэтую справу і паведаміць рэдакцыю аб выніках.

# Няма гаспадарчага вока

(ЛІСТ СЕЛЬКОРА)

Калгас у вёсцы Сяляўшчына, Расонскага раёну мае ільнаводны ўхіл і мае ўсе магчымасьці для таго, каб пашыраць ільнаводную гаспадарку. Але ў гэтым калгасе адсутнічае кіраўніцтва. Старшыня калгасу тав. Шарпенка кожны дзень езьдзіць да сваёй сям'і, якая знаходзіцца за чатыры вярсты ад калгасу, прычым ён ад'яжджае амаль што з палавіны дня, а назаўтра прыходзіць на работу каля 11 гадз. раніцы.

Такім чынам ён ніколі ня ведае, калі калгасьнікі выходзяць на работу, калі прыходзяць з работы. Рабочая сіла выкарыстоўваецца нерацыянальна, брыгады ня маюць заданьня наперад—што трэба рабіць, а ідзе ўсё стыхійна, самацёкам.

Адсутнічае кіраўніцтва калгасам як з боку сельсавету, так і партячэйкі, ня кажучы аб працаўніках райкалгасасаюзу, якія праяжджаюць «кавалерыйскім наскокам» і то ў паўгода раз.

У выніку гэтага ў калгасе ёсьць цэлы рад прарываў. Ня выпалан лён, гарадніна. Каровы выганяюцца на пасьбішча (на вячорку) а 5-ай гадзіне, а раніцай прыходзяць з поля а 10-ай гад. Цяляты цэлыя ночы ходзяць па капусьце, буракох. Сельска-гаспадарчыя машыны і дробны інвэнтар валяюцца дзе папала,—пазарасталі травой на полі.

З-за нядбайных адносін даглядчыкаў пала чатыры жарабкі. 18-га ліпеня г. г. паў самы лепшы жарабок, якога заезьдзіў старшыня. Гэта выклікала абурэньне калгасьнікаў.

Астаўшыяся зярнёвыя прадукты ўра джаю 1931 г. старшыня выдае ў лік прададзён 1932 г. Такім чынам атрымалася, што той, хто не працаваў у мінулым 1931 годзе, атрымлівае гэтыя прадукты цяпер. Атрымлівае іх у тым ліку і старшыня калгасу.

Такое разьмеркаваньне выклікала ў калгасьнікаў пасьпяшасьць да работы.

Партыйная ячэйка, сельсавет, якія штодзень наглядаюць усю гэтую злачынную безгаспадарчасьць у калгасе прытупілі сваю палітычную пільнасьць, ніяк на гэта не рэагуюць.

Расонскаму РК, КП(б)Б, РКК-РСІ і Райкалгасасаюзу патрэбна ўмяшацца і наладзіць работу ў калгасе вёскі Сяляўшчына.

СЕЛЬКОР.

# Пакараць за растрату

(Ліст селькора)

Рэвізійнай камісіяй калгасу «Зара» (Сінчанскага сельсавету, Пухавіцкага раёну) было ўстаноўлена, што старшынёй гэтага калгасу растрачана 300 руб лёў. Да таго-ж шмат рахункаў за будынкі, якія арандаваў у калгасе леспрамгас на прыбытак не запісаны. Есьць і такія выпадкі, калі адзін рахунак запісваўся на прыбытак па два разы, а рэвізійная камісія, падрабязна і поўна растрату ўстанавіць не магла.

Старшыня калгасу «Зара», будучы раней крамнікам, растраціў у краме 300 руб. і, як відаць, хоча пагасіць ці? гэтую растрату калгаснымі грашыма.

Ня гледзячы на тое, што растрата выкрыта даўно, да гэтага часу ніхто ня цікавіцца гэтай справай.

Старшыня нашага калгасу павінен быць пакаран за растрату калгаснай маемасьці, як гэта і кажуць апошнія пастановы ўраду.

Дзяркач.

Ад рэдакцыі: Рэдакцыя просіць Пухавіцкага раённага пракурора паведаміць, чаму старшыня-растратчык калгасу «Зара» ня прыцягнуты да адказнасьці

# Ударыць па апартуністах

У Маслакоўскім сельсавеце, Горацкага раёну, 31 ліпеня меркавалася правесьці масавы аднадзеньнік вывазкі лесу.

Маслакоўскі сельсавет у часе месячніку лесавывазак павінен быў вывезьці 500 куб. мтр. лесу, а вывез фактычна ўсяго 30 куб. мтр. пры наяўнасьці 900 штук рабочых коняй.

Па прапанове сельсавету і сельячэйкі масавы аднадзеньнік быў перанесены на 2 жніўня і з-за таго, што прэзыдыум сельсавету і сельячэйка ніякага ўдзелу у гэтай справе не прынялі, ад надзеньнік быў сарваны, літаральна ні адна хурманка ня выехала. на лесавывазкі. Такім-жа чынам быў сарваны ня дзельнік 25 ліпеня.

Калі дзесятнік леспрамгасу Лагуноў зьвярнуўся да старшыні сельсавету т. Быкава з просьбай дапамагчы па лесавывазках, апошні сказаў, што «вазіць лес справа не сельсавету, а леспрамгасу».

1-га жніўня да праяжджаўшага сакратара сельячэйкі тав. Лабуса дзесятнік Лугаўцоў, культнаглядчык Астраноў і лясьнік Клімаў зьвярнуліся з пытаньнем: «што рабіць». На гэта тав. Лабус махнуў рукой і паехаў далей.

Зрыў месячніку і двухнядзельнікаў зьяўляюцца вынікам насумленнай, апартуністычнай работы партячэйкі і сельсавету.

Федасюк.

# Яшчэ ня скончылі ворыва папару

КЛІМАВІЧЫ. (Наш кар.). Раён павінен сёлета падняць 7.500 га папару. Ня гледзячы на тое, што праз некалькі дзён пачнецца сяўба азімины, у радзе калгасаў ворыва папару яшчэ ня скончана. Асабліва запазваецца падняцьце папару ў Зьвянчыцкім, Склімінскім, Гацкім і Мілаславіцкім сельсаветах.

Райкалгасасаюз апэрацыйна ня кіруе гэтай справай, няма належнага нагляду, з боку раённых арганізацый за асеньняй сяўбой. Масавая растлумачальная работа па пытаньні сяўбы сярод калгасьнікаў, бедняцкоў і серадняцкоў—аднаасобнікаў не разгорнута.

Сяўбу азімины трэба правесьці своячасова, з выкананьнем ўсіх агратэхнічных мерапрыемстваў. Вось чаму ўсе партячэйкі і сельсаветы павінны неадкладна пераключыцца на правядзеньне сяўбы азімины.

П. Кавалёў.

# Пуцёўка павінна быць прынята

## З 22-га жніўня пачынаем справаздачы гарсаветаў

## Арганізуем завочную справаздачу пра ход рэалізацыі пуцёўкі імя 3 сэсіі ЦВК

Больш дэкады прайшло з таго часу, як рэдакцыя газэты «Савецкая Беларусь», сумесна з арганістрам ЦВК і радыё-газэтай «За бальшавіцкія тэмпы», арганізозан 2-хмесячны паход саветаў і ўручана пуцёўка імя 3-й сесіі ЦВК БССР па ажыцьцяўленьні рашэньняў ліпеньскага аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б і 3-й сэсіі ЦВК БССР.

Прайшоўшы пэрыяд зусім дастатковы для прынцыпіяльнага гэтай пуцёўкі, для намячэньня раду канкрэтных мерапрыемстваў па рэалізацыі пуцёўкі і нават гэты час быў дастатковы для мабілізацыі шырокіх мас выбаршчыкаў сумесна з якімі трэба было прыступіць да канкрэтнай работы па рэалізацыі намечаных гарсаветам і дэпутацкімі групамі плянаў праведзеньня ў жыцьцё пуцёўкі дапасоўна да ўмоў кожнага гарсавету, сэкцыі і дэпутацкай групы.

Але адсутнічаньне вядзіцкаў з боку большасьці саветаў і дэпутацкіх груп аб прынцыпі імі пуцёўкі імя 3-й сэсіі ЦВК БССР і намечаных канкрэтных мерапрыемстваў гарсаветамі і дэпутацкімі групамі па яе рэалізацыі—з усёй яскравасьцю гаворыць нам аб тым, што большасьць саветаў і дэпутацкіх груп не прынялі пуцёўку. Праўда ёсьць частка саветаў, якія прынялі пуцёўку, але аб гэтым пралетарская грамадзкасьць і калгасьнікі яшчэ ня ведаюць. Шырокія колы выбаршчыкаў ня толькі не мабілізаваны для практычнага ўдзелу ў рэалізацыі мерапрыемстваў, высунутых пуцёўкай,—яны нават ня ведаюць аб тых канкрэтных мерапрыемствах, якія намечаны па рэалізацыі гэтай пуцёўкі. Гэта сьведчыць аб фармальна-бюракратычным падыходзе раду саветаў да гэтай важнейшай справы і габінэтным вырашэньні яе. Большасьць гарсаветаў апардуністычна недаацаніла сваёй-жа ролі. у выкананьні цырэктыў партыі і ўраду, у прыватнасьці па арганізацыі вырабу тавараў шырокага спажываньня і па разгортваньні калгаснага гандлю.

Газэта «Савецкая Беларусь» сумесна з арганістрам ЦВК у парадку праверкі праробленай работы саветамі па першым этапе ходу пуцёўкі імя 3-й сэсіі ЦВК, у якім павінна была быць скончана ўся арганізацыйная работа, а там сама работа па правядзеньні ўступнага пэрыяду 2-га этапу пуцёўкі, арганізуе папярэднюю завочную справаздачу гарсаветаў.

Завочная справаздача ставіць сваёй мэтай заслухаць даклады старшынь гарсаветаў аб праробленай гарсаветамі працы па рэалізацыі пуцёўкі.

Трыбунай для дакладаў будзе газэта «Савецкая Беларусь». Праз старонкі газэты пралетарская грамадзкасьць і калгасьнікі павінны атрымаць ад старшынь саветаў канкрэтныя ня двухсэнсавыя адказы. Старшыні гарсаветаў павінны расказаць аб тым, што зроблена імі, што зрабілі асобныя сэкцыі саветаў і дэпутацкія групы па рэалізацыі мерапрыемстваў, якія высунуты пуцёўкай. Саветы павінны сказаць, як канкрэтна яны праводзяць у жыцьцё рашэньні 3-яй сэсіі ЦВК, як яны мабілізавалі шырокія масы выбаршчыкаў вакол пытаньня вырабу тавараў шырокага спажываньня, разгортваньня калгаснага гандлю, якія маюцца посьпехі і вынікі ў рабоце савецкіх і дэпутацкіх груп, як канкрэтна савет ажыцьцяўляе кіраўніцтва дэпутацкімі групамі па выкананьні гэтых задач. Яны павінны паказаць добрыя вопыты работы дэпутацкіх груп, як скарыстоўваецца гэты вопыт работы ў слабейшых па рабоце дэпутацкіх групах, як канкрэтна гарсаветы аказваюць дапамогу дэпутацкім групам калгасаў у наладжваньні сваёй работы, у прыватнасьці па пытаньні разгортваньня калгаснага гандлю. Старшыні гарсаветаў павінны таксама расказаць аб укараненьні ў рабоце дэпутацкіх груп элемэнтаў сацыялістычных мэтадаў работы. Ці арганізавана спаборніцтва паміж дэпутацкімі групамі па рэалізацыі пуцёўкі 3-яй сэсіі ЦВК і расказаць аб канкрэтных выніках спаборніцтва.

З 22-га па 26-га жніўня адчыняцца завочную справаздачу.

Першы дзень, 22-га жніўня даем слова наступным старшыням гарсаветаў: Аршанскага, Веткаўскага, Гарадоцкага і Дзяржынскага.

Другі дзень, 23-га жніўня, даем слова старшыням Бабруйскага, Барысаўскага, Быхаўскага, Рагачэўскага і Слуцкага гарсаветаў.

3-ці дзень, 24-га жніўня—старшыням Віцебскага, Горацкага, Жлобінскага, Клімавіцкага і Крычаўскага гарсаветаў.

4-ты дзень, 25-га—жніўня старшыням: Магілеўскага, Шклоўскага, Полацкага, Мазырскага і Рэчыцкага гарсаветаў.

26-га жніўня, пяты і апошні дзень, усім астатнім непералічаным тут гарсаветам.

Не пазьней 20-га жніўня мы чакаем матар'ялаў ад усіх дакладчыкаў.

Зьмяшчэньне дакладаў на старонках газэт дасьць магчымасьць гарсаветам падзяліцца вопытам сваёй працы і яшчэ больш мабілізаваць пралетарскую грамадзкасьць і калгасьнікаў на выкананьне вялізарнейшых задач, якія рашаліся на ліпеньскім аб'яднаным пленуме ЦК і ЦКК КП(б)Б і 3-й сэсіяй ЦВК БССР.

Адсутнічаньне дакладаў гарсаветаў да вызначанага часу будзе у значнай ступені сьведчыць аб тым, што яны ў выкананьні гэтых задач нічога не зрабілі.

РЭДАКЦЫЯ «САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ»

Калгасьнікі атрымліваюць натураль ны аванс абмалочаным зярном

## З АДОЗВЫ ЎСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЬЛЁТУ ДЭПУТАЦКІХ ГРУП МЭТАЛЯПРАМЫСЛОВАСЬЦІ БССР

Рабочая кляса і працоўныя Савецкага саюзу, пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі і яе ленінскага ЦК на чале з тав. Сталіным, дамагліся вялізарнейшых посьпехаў у справе сацыялістычнага будаўніцтва. Па важнейшых галінах прамысловасьці—па здабычы нафты, выплаўцы чыгуну, вырабе с.-г. машын—мы выйшлі на першае месца ў Эўропе, пакінуўшы ззаду сябе такія дзяржавы, як Германія, Англія, Францыя.

Творчая актыўнасьць мільёнаў рабочых, інжынэрна-тэхнічных работнікаў і гаспадарнікаў накіравана на ажыцьцяўленьне лёзунгу партыі аб вызваленьні СССР ад замежнай тэхнікі-эканамічнай залежнасьці. На нашых заводах будуюцца трактары, аўтамабілі, камбайны, блюмінгі, мэталяпрацоўчыя варштаты, крэкінгі і трубчаткі, магутныя турбіны і генэратары. Намі створана такая індустрыя, якая дазваляе нам любую машыну вырабіць на савецкіх заводах.

Пабудаваны моцны фундамант сацыялістычнай эканомікі. Вырашана ў жарысьць сацыялізму ленінскае пытаньне —хто—каго», вырашана беспаваротна ў горадзе і ў вёсцы.

Першая пяцігодка пасьпяхова выкананая ў чатыры гады. Рабочыя і працоўныя нашай краіны працуюць пяцігодкі—пяцігодкі пабудовы сацыялізму.

Няўхільнае правядзеньне ленінскай нацыянальнай палітыкі стварыла ў Беларускай ССР умовы, у якіх Савецкая Беларусь нябачанымі тэмпамі разьвівае прамысловасьць і сельскую гаспадарку, становіцца на ўзровень перадавых савецкіх рэспублік.

У 1927 годзе ў Савецкай Беларусі было 25 тысяч рабочых. Цяпер беларуская прамысловасьць мае пралетарскія кадры ў 175 тысяч. З году ў год падвышаецца ўдзельная вага прамысловасьці ў агульнай сыстэме народнай гаспадаркі БССР.

Гэтых посьпехаў мы дамаглісь пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі і дзякуючы растучай актыўнасьці рабочых і калгасных мас.

Лёзунг партыі «Саветы тварам да вытворчасьці» паслужыў вагаром перабудовы ўсіх мэтадаў савецкай работы. Стварэньне дэпутацкіх груп на прадпрыемствах зьявілася адным з канкрэтных выражэньняў павароту тварам да вытворчасьці.

Сабраўшыся на арганізаваны ЦВК БССР першы ўсебеларускі зьлёт дэпутацкіх груп металяпрамысловасьці разам з дэпутацкімі групамі Маскоўскага заводу «Дынамо»—ініцыятара дэпутацкага паходу за тэхніка-эканамічную незалежнасьць БССР і ленінградзкага заводу «Чырвоны Пуцілавец», дэлегаты зьлёту атрымалі магчымасьць заслухаць вычэрпваючыя даклады дэпутацкіх груп аб іх барацьбе за эканамічную незалежнасьць, за палепшаньне рабочага забясьпечаньня, за мабілізацыю ўнутраных рэсурсаў і за разгортваньне савецкай работы на вытворчасьці.

Зьлёт паказаў вялізарнае значэньне і практычныя посьпехі дэпутацкіх груп у розных галінах іх дзейнасьці. Наш вопыт можа паслужыць зброяй для дэпутацкіх груп металяпрамысловасьці Саюзу ў справе палепшаньня па становіцы савецкай работы на прадпрыемствах

### БАРАЦЬБА ДЭПУТАЦКІХ ГРУП ЗА ЭКАНАМІЧНУЮ НЕЗАЛЕЖНАСЬЦЬ СССР

Дэпутацкія групы металязаводаў БССР падхапілі заклік дэпутацкай групы заводу «Дынамо» і актыўна ўключыліся ў абвешчаны дынамаўцамі дэпутацкі паход за тэхніка-эканамічную незалежнасьць СССР.

Адзін час завод Гомсельмаш адчуваў востры недахоп балтоў. Дэпутацкая група вылучыла спэцыяльную брыгаду і зараз плашкі для імпартных болтарэзных варштатаў робяцца на заводзе. Член гарсавету тав. Сіцько знайшоў раствор для спайкі кусочкаў пабядзіту. Дзякуючы гэтаму вынаходзтву завод эканоміць 10.000 рублёў.

У сувязі з пашырэньнем заводу адміністрацыя падала заяўку на 23 імпартных варштаты. Дэпутацкая група пра верыла заяўку і знайшла магчымым 11 варштатаў замяніць сваімі, з чым адміністрацыя згадзілася.

Дэпутацкая група заводу «Чырвоны мэталіст» (Віцебск) паставіла перад адміністрацыяй задачу арганізацыі вырабу вузкіх імпартных цыркулярнай пілы для рэзкі мэталяў. Дэпутацкая група разьвіла творчую ініцыятыву рабочых і зубы былі зроблены.

Дэпутацкая група заводу «Камунар» (Менск) узяла пад свой нагляд выраб бульбяного камбайну—вынаходзтва рабочага саўгасу т. Казлоўскага.

На гэтым-жа заводзе па ініцыятыве дэпутацкай групы сумесна з работнікамі «БРЫЗ» пайка швоў бідонаў на што ішло імпартнае волава, заменена электразваркай. Гэтае мерапрыемства дало заводу 18 тысяч руб. эканоміі, вызваліўшы завод ад імпарту дэфіцытнага матар'ялу.

На заводзе «Пралетары» (Гомель) па настойваньні дэпутацкай групы адміністрацыяй быў прыняты заказ Коксаснабзбыту на помпы «Вэртынгтона». Для кантролю за выкананьнем заказу дэпутацкая група вылучыла пасты па два чалавекі ў тых цэхах, якія выраблялі дэталі для помпаў.

Выкананьне паступіўшых на гэты завод заказаў для чорнай мэталюргіі затрымлівалася выключна з-за адсутнасьці матар'ялу. Дэпутацкая група зьвярнулася з листом да дэпутацкіх груп заводаў—пастаўшчыкаў да тав. Пятакова і тав. Рудзутака, адказ быў атрыман чыгунам.

Большасьць аўтабусаў сыстэмы «Штэер», астанавіліся з-за адсутнічаньня чарвячной шасьцярні. Рабочы заводу «Чырвоны адраджэнец»—дэпутат савету, унёс прапанову, якая дала магчымасьць выраблять фрэзэроўку чарвячной шасьцярні на звычайным такарным варштаце. Дэпутацкая група ўзяла пад кантроль выкананьне заказаў на чарвячныя шасьцярні.

На Акулярнай фабрыцы (Віцебск) тры з паловай гады стаяў без скарыстаньня імпартны варштат для вырабу двухфокуснага шкла. Між тым двухфокусныя акуляры выпісваліся з-за мяжы. Дэпутацкая група прыцягнула замежнага спэцыяліста, які пусьціў варштат і падрыхтаваў кадры, зараз фабрыка прыступіла да вырабу двухфокусных акуляраў.

### РАБОТА ДЭПУТАЦКІХ ГРУП ПА МАБІЛІЗАЦЫІ І СКАРЫСТАНЬНІ ЎНУТРАНЫХ РЭСУРСАЎ

Зьлёт лічыць неабходным адзначыць рознастайны вопыт дэпутацкіх груп у барацьбе за мабілізацыю і скарыстаньне ўнутраных рэсурсаў мэталя заводаў БССР.

Дэпутацкая група заводу імя «Варашылава» (Бабруйск) замяніла медныя часьці чорным мэталем пры вырабе маталак для швэйнай прамысловасьці. Дэпутацкая група Віцебскага заводу «Камінтэрн» замяніла сьвінец на шківах чыгуном. На Гомельскім заводзе «Пралетары» пры вырабе выртынгтонаўскіх помпаў заменена бронза на сальніках; латунь на штопах заменена бясэмэраўскай сталью, завод адмовіўся ад медзі для ажышных гаек пры апрацоўцы крантаў.

Побач з барацьбой за замену каляровых мэталяў чорнымі, дэпутацкія групы змагаюцца за скарыстаньне дрэва ў якасьці замяніцеля. Завод «Ударнік» (Менск), дзякуючы ініцыятыве дэпутацкай групы, пры вырабе вагаў, падымальнай магутнасьцю да трох тон, замяніў мэталічныя швэдара дубовымі. Па настойваньні дэпутацкай групы заводу Гомсельмаш была праведзена прапанова інжынэра Санаторскага па замене ў сілосарэзках дэфіцытных жалезных швэлерных бэлак драўлянымі.

Дэпутацкія групы, уселяк падтрымліваючы рацыяналізатарскую думку, пасьлядоўна змагаюцца за ўкараненьне электразваркі.

Многа зроблена дэпутацкімі групамі ў барацьбе за эканомію мэталю.

Галоўны напрамак утылізацыі адыходаў—выраб прадметаў шырокага спажываньня. Дэпутацкая група заводу імя Сталіна ў Бабруйску з адыходаў кацельнага цэху наладзіла выраб некалькіх тысяч тапароў, матыг, малаткоў і бабак. Завод «Ударнік» з абрэзкаў выробляе падкоўкі для ботаў і падковак наогул. Тут-жа па ініцыятыве дэпутацкай групы арганізуецца спэцыяльны замочны цэх для вырабу вісячых замкоў з адыходаў вытворчасьці. На заводзе імя Варашылава (Бабруйск), дзякуючы стандартызацыі абрэзкаў, арганізаван выраб маталак, вы працавана 40.000 лыжак і іншых тавараў шырспажыву. Вялікую працу па вырабу тавараў шырспажыву прарабіў завод «Камунар».

### РОЛЯ ДЭПУТАЦКІХ ГРУП У СПРАВЕ ПАЛЕПШАНЬНЯ МАТАР'ЯЛЬНАГА СТАНОВІШЧА РАБОЧЫХ

Дэпутацкія групы прадпрыемстваў мэталяапрацоўчай прамысловасьці Беларускай ССР у радзе выпадкаў змаглі накапіць надзвычайна каштоўны вопыт па палепшаньні матар'яльна-бытовага становішча рабочых.

Выключнае значэньне набывае зараз рацыянальная пастаноўка працы прыгарадных гаспадарак. Дэпутацкая група заводу Гомсельмаш актыўна ўдзельнічае ў арганізацыі і штодзеннай работце прыгараднай гаспадаркі заводу.

Вопыт кіраўніцтва і дапамогі прыгараднай гаспадарцы ёсьць у дэпутацкай групе заводу імя Ланцуцкага. Там перад самай сяўбой аказалася нястача вялікай колькасьці насеньня. У тры раёны Беларусі былі пасланы члены дэпутацкай групы—члены Гомельскага гарсавету для загатоўкі насеньня. Насеньне было загатоўлена ў тэрмін.

Дэпутацкая група заводу «Чырвоны мэталіст» (Віцебск) арганізавала і правяла пробны выезд рабочых прыгараднай гаспадаркі ў поле. Дэпутацкая група заводу вылучыла спэцыяльную брыгаду рабочых, якія ведаюць умовы апрацоўкі глебы, для інструктаваньня прыехаўшых з Украіны рабочых.

Дэпутацкая група заводу «Камінтэрн» (Віцебск) арганізавала сталы нагляд за якасьцю сяўбы шляхам кантрольных пастоў і пасылку спэцыяльных брыгад.

Узорам работы дэпутацкай групы ў прыгараднай гаспадарцы можа служыць дэпутацкая група заводу «Камунар» (Менск), яна дабілася алнаўленьня работы ў зусім разбуранай гаспадарцы.

Заслугоўвае ўвагі вопыт дэпутацкіх груп па трусагадоўлі. На заводзе Гомсельмашу дэпутацкая група першая зьвярнулася да рабочых дрэваапрацоўчага цэху з заклікам скарыстаць для клетак адыходы дрэва. Гэты заклік знайшоў жывы водгук з боку рабочых дрэваапрацоўчага цэху: на працягу трох дзён было загатоўлена 100 клетак. Дэпутацкая група ўстанавіла на трусатніку сталы пост.

Дэпутацкая група заводу «Камунар» (Менск) узяла шэфства над пабудовай трусатніка, накіравала на Каўказ двух дэпутатаў для закупкі трусоў.

Значную ўвагу ў сваёй рабоце дэпутацкія групы аддалі пастаноўцы грамадзкага харчаваньня. Тут зноў-такі ў якасьці ўзорнага прыкладу трэба паказаць работу дэпутацкай групы заводу «Камунар» (Менск). Дэпутацкая група, зрабіўшы паведамленьне на трыкутніку заводу, патрабавала неадкладнай арганізацыі новай сталоўкі і гэтага дамаглася. З самага-ж пачатку работы гэтай сталоўкі дэпутацкая група ўзяла на сябе дапамогу і штодзенны нагляд за яе работай. Дэпутацкая група дамаглася ўкараненьня сацыялістычных мэтадаў работы ў сталоўцы: рабочы зараз траціць на абед ня больш 15—20 хвілін.

Па ініцыятыве дэпутацкай групы заводу «Чырвоны мэталіст» (Віцебск) уведзена ў сталоўцы паблюдная сыстэма.

Зьлёт лічыць неабходным падкрэсьліць вопыт дэпутацкай групы «Камунар» (Менск) па арганізацыі дзіцячага саду пры заводзе. Дэпутацкая група ня толькі знайшла адпаведнае памяшканьне, але і сваімі сіламі з адыходаў вытворчасьці зрабіла столікі, лаўкі і лыжкі для дзяцей. Дэпутацкая група ўзяла на сябе кіраўніцтва і нагляд за адборам дзяцей, якія зьмяшчаюцца ў гэты дзіцячы сад.

### ДЭПУТАЦКАЯ ГРУПА, ЯК ВАЖНЕЙШАЕ ЗЬВЯНО МАСАВАЙ САВЕЦКАЙ РАБОТЫ НА ВЫТВОРЧАСЬЦІ

Пасьпяховасьць барацьбы дэпутацкіх груп за выкананьне прамфінпляну, за эканамічную незалежнасьць СССР, за палепшаньне матар'яльна-бытавога і культурнага абслугоўваньня рабочых вызначаецца і забясьпечваецца іх масавай работай, плянавасьцю і правільным кіраўніцтвам з боку партарганізацый і гарсаветаў.

Дэпутацкія групы заводаў Гомсельмаш, «Чырвоны мэталіст», «Камунар», «Камінтэрн» і інш. маюць пляны работ, прычым дэпутацкая група заводу «Камунар» працуе паводле пляну ўжо каля двух гадоў.

На заводзе імя Ланцуцкага пляны перадаюцца на абгаварэньне шырокіх мас, пасьля плян даводзіцца да кожнага дэпутата і брыгады.

Узор пнуткасьці паказала дэпутацкая група заводу Гомсельмаш. Тут памеры неабходнасьці і па сыгналах кантрольных пастоў арганізуюцца часовыя брыгады па розных пытаньнях і галінах працы. У брыгады звычайна прыцягваюцца спэцыялісты. Мэтад расстаноўкі пастоў па розных вучастках практыкуецца і на іншых заводах («Камунар», імя Ланцуцкага, «Чырвоны мэталіст», Акулярная фабрыка). Асабліва мощную разгаліненую сетку мае дэпутацкая група на заводзе «Камунар» (16 брыгад і пасты ў кожным цэху).

Брыгадны і паставы мэтад цалкам апраўдаў сябе і яго неабходна ўсяляк узмацняць і разьвіваць.

Па ўцягненьні рабочых у савецкую работу на першым месцы стаіць завод «Камунар», на якім на 900 рабочых ёсьць 9 дэпутатаў, што змаглі арганізаваць 150 чал. актыву. На заводзе Гомсельмаш на 2000 рабочых ёсьць 11 дэпутатаў і 106 чал. актыву. «Чырвоны мэталіст» на 900 рабочых мае 12 дэпутатаў, 60 чал. актыву.

Лепшы вопыт партыйнага кіраўніцтва мае месца на заводзе Гомсельмаш. Дэпутацкая група рабіла даклад аб сваёй рабоце на бюро гаркому КП(б)Б. Бюро заводзкага парткалектыву кіруе работай дэпутацкай групы і абгаварвае на сваіх паседжаньнях пытаньні савецкай работы.

Лепшыя ўзоры кіраўніцтва дэпутацкімі групамі з боку гарсаветаў ёсьць у Гомелі. Гарсавет гэтага гораду стварыў інстытут пазаштатных інструктароў, якіх прымацаваў да дэпутацкіх груп.

Адміністрацыя большасьці заводаў садзейнічае рабоце дэпутацкіх груп. На заводзе імя Ланцуцкага адміністрацыя трымае дэпутацкую групу ў курсе ўсіх мерапрыемстваў на заводзе і ў радзе выпадкаў зьвярталася да групы за садзейнічаньнем.

Дэпутацкія групы заводаў імя Сталіна, «Камунар» і Гомсельмаш маюць свае насьценныя газэты і ўдзельнічаюць у агульнаазводзкіх насьценгазэтах і шматтыражках.

Перадаючы свой вопыт прадпрыемствам мэталяпрамысловасьці Савецкага саюзу, мы спадзяемся праз цэнтральны орган ураду «Известия ЦИК СССР и ВЦИК» правесьці абмен вопытам дэпутацкіх груп з іншымі заводамі для далейшага палепшаньня савецкай работы на нашых прадпрыемствах.

Мы просім ЦВК Саюзу ССР да XV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі склікаць усесаюзны зьлёт лепшых дэпутацкіх груп мэталязаводаў, якія паказалі ўзорную работу ў барацьбе за вызваленьне СССР ад тэхніка-эканамічнай залежнасьці, за поўную рэалізацыю шасьці гістарычных умоў тав. Сталіна, за мабілізацыю ўнутраных рэсурсаў, за палепшаньне матар'яльна-бытавога абслугоўваньня рабочых, за лепшую пастаноўку савецкай работы на прадпрыемствах мэталяпрамысловасьці.

Мэтадамі сацспаборніцтва і ўдарніцтва пад кіраўніцтвам партыйных і савецкіх арганізацый мы будзем рашуча змагацца за ўзорную пастаноўку савецкай работы на мэталязаводах БССР, за права ўдзелу на ўсесаюзным зьлёце лепшых дэпутацкіх груп мэталяпрамысловасьці.

Першы Ўсебеларускі зьлёт дэпутацкіх груп мэталяпрамысловасьці.

# Хімізацыя народнай гаспадаркі ў другой пяцігодцы

Нядаўна скончылася ўсебеларуская нарада па хімізацыі народнай гаспадаркі БССР у другой пяцігодцы. Нарадай распрацаваны асноўныя пытаньні хімізацыі прамысловасьці, сельскай гаспадаркі, пытаньні падрыхтоўкі хім кадраў і г. д.

У другой пяцігодцы ў БССР праектуецца разьвіцьцё магутнай хімічнай прамысловасьці, у прыватнасьці тукавы выраб складаных і камбінаваных угнаеньняў. У сувязі з гэтым вызначана пабудова магутнага хімкамбінату па вырабе прэцытытату сульфатнага амонію, аміячнай сэлетры, лейна-сэлетры і г. д.

Камбінат, паводле гэтага праекту, базуецца на мясцовай сыравіне (торф), з якое будзе вырабляцца вадарод, затым аміяк і большасьць яго акісьленьняў. Разам з фасфарытам гэта дае цэлую гаму складаных і камбінаваных тукаў. У сыстэме камбінату запраектавана хімічнае скарыстаньне магутных покладаў сапрапэлітаў, у выніку скарыстаньня якіх БССР атрымае цэлую гаму маслаў лёгкіх і цяжкіх, маторных і газавых (газа, бензыны і г. д.). Адыходы-ж хімічнай апрацоўкі сапрапэлітаў у выглядзе попелу будуць скарыстоўвацца як вяжучыя-матар'ялы для вырабу будматар'ялаў.

Камбінат уключае ў сябе таксама выраб пластычных мас, аднак гэтае пытаньне, як высьвятлілася на нарадзе, яшчэ дастаткова не прапрацавана.

Нажаль, праблема хімкамбінату хоць і мае значную даўнасьць (каля 3-х год па лініі хімаб'яднаньня, (але прапрацавана яшчэ слаба з пункту погляду тэхнічна-эканамічнага абгрунтаваньня і не падпала яшчэ шырокай крытыцы на буйнейшых прадпрыемствах, а таксама і глыбокаму аналізу з боку навукова-дасьледчых інстытутаў і ўстаноў.

Вузкім месцам гэтай праблемы зьяўляецца слабая прапрацоўка сыравіннай базы для камбінату, асабліва ў частцы торфамасываў, большая частка якіх дасьледавана або рэкагнасцыравана, або зусім не дасьледвана. Уся гэта праблема патрабуе тэрміновай арганізацыі дэталёвага хімічнага вывучэньня торфамасываў у раёнах Прапойск-Быхаў (месца арганізацыі камбінату) сіламі навукова-дасьледчага інстытуту прамысловасьці БССР з тым, каб скарыстаўшы для гэтай мэты сэзон 1932 г., у 1933 г. пачаць ужо папярэднія наміткі па правядзеньні дасьледваньняў для большай торфахімії.

Мяркуецца, што сума капіталаўкладаньняў у камбінат за другую пяцігодку ўкладзецца ў 126 млн. руб. Камбінат дасьць магчымасьць задаволіць патрэбу БССР па зьвязным азоце на 50 проц. Пры камбінаце таксама прадугледжваецца электрахімічны выраб соды і кальцы-карбіду. Гэта дасьць магчымасьць узмацніць тукавую прамысловасьць БССР каштоўнейшым відам угнаеньня—цыян-амідам і мачавінай, што мае калёсальнае значэньне для досьць пашыраных у БССР кіслотных глеб. Побач з разьвіцьцём магутнага камбінату па вырабе складаных і камбінавых тукаў БССР ня можа адмовіцца ад фарсаванага скарыстаньня для сельскай гаспадаркі фасфарытаў у выглядзе мукі, прычым якасьць мукі (тонкасьць памолу) павінна быць значна палепшана.

Па другой праектоўцы хімкамбінату, высунутай работнікамі Дзяржпляну БССР, намячаецца скарыстаньне групы балот у Мазырскім і Асіпавіцкім раёнах. Вузкім месцам гэтай праектоўкі зьяўляецца адсутнасьць побач фасфарытаў, але сыравінная база тут больш прапрацавана і вывучана, як у колькасных, так і ў якасных адносінах, чым у раёне Прапойску. Пры гэтым другая праектоўка дае больш пашыраную спэцыфікацыю прадуктаў тукавай прамысловасьці і прадугледжвае абавязковы выраб цыян - аміду і мачавіны. Гэтая праектоўка камбінату ўпяршыню на нарадзе падпала крытыцы і ў недастатковай ступені апрабіравана з пункту погляду патрэбнасьці ўвязкі электраэнэргіі (таннасьць яе) для электрахімії, а таксама некаторых неабходных увязак з тэхналёгічнага боку.

Нарада адзначыла, што пытаньні тэрмічнай і хімічнай пераапрацоўкі мясцовай сыравіны ў частцы скарыстаньня вялікіх запасаў торфу, крэйды, далямітаў, сапрапэляў для хімічнай прамысловасьці не падпадалі яшчэ сур'ёзнай і дэталёвай прапрацоўцы. У вядомай ступені гэтаму перашкаджае адсутнасьць чоткага разьмеркаваньня функцый паміж адпаведн

Сьцяг ЦВК БССР атрымае лепшае дэпо

# Гомельскае дэпо змагаецца за званьне лепшага

## БОЛЬШ ЭНЭРГІЧНА ЗМАГАЦЦА ЗА СЬЦЯГ ЦВК БССР

Чыгуначныя дарогі БССР у самы бліжэйшы час уступаюць у паласу непасрэднай работы па перавозцы грузаў восені і зімы. У самы бліжэйшы час пачынаецца адказны і патрабавальны экзамен, посьпех якога цалкам вырашае сваячасовая і добраякасная падрыхтоўка, мабілізацыя ўсіх чыгуначных рабочых на баявую і ўдарную работу на ўсіх вучастках транспарту.

У тыя невялікія дні, якія засталіся да пачатку асеньня-зімовых перавозак, ад транспарту патрабуюцца асаблівa чоткія і ўдарныя тэмпы падрыхтоўчай работы. Трэба, каб кожны вучастак; кожнае дэпо, кожная рабочая адзінка падрыхтавалі свае сродкі і сілы для таго, каб асеньня-зімовыя перавозкі распачаць сваячасова і належна выканаць усе перавозачныя пляны.

На вялікі жаль, трэба канстатаваць, што на большасьці вузлоў чыгуначных дарог БССР падрыхтоўка да перавозак праходзіць яўна нездавальняюча. На радзе вузлоў замест падвышэньня тэмпаў падрыхтоўчай работы, наглядаецца правал работы і гэта асабліва датычыцца чыгуначных станцый.

Мы ні адзін раз пісалі аб дрэннай рабоце Жлобінскага чыгуначнага раёну, паказваючы на прычыны гэтага. Адзін з асноўных прычын прарыву на Жлобінскім вузле зьяўляецца слабая работа дэпутацкіх груп на вузле і дрэнная кіраўніцтва імі з боку Жлобінскага гарсавету. Пастанова ЦВК БССР аб рабоце Жлобінскага гарсавету павінна быць рашучым чынам ажыцьцёўлена ў рабоце гарсавету, бо ён нясе такую-ж адказнасьць за асеньня-зімовыя перавозкі, як і парэтыйныя і прафсаюзныя арганізацыі самога вузла.

Дрэнна працуюць дэпутацкія групы Аршанскага чыгуначнага вузлу. Аршанскі гарсавет павінен зьвярнуць сур'ёзную ўвагу на тое, што яго групы на вузле слаба рыхтуюцца да асеньня-зімовых перавозак, слаба змагаюцца за сьцяг ЦВК БССР.

**Станцыя Віцебск, ст. Рэчыца і рад іншых станцый** замаражваюць грузапаток, не забясьпечыўшы бесьперабойнае прасоўваньне грузаў пралетарскім цэнтрам і тых грузаў, якія хутка псуюцца. Адказнасьць за дрэнную работу гэтых станцый нясуць і гарсавети і дэпутацкія групы і таму яны ніяк ня могуць заставацца ў баку ад практычнай работы па прасоўваньні грузаў.

Кожны вучастак работы сацыялістычнага транспарту—гэта вучастак для работы дэпутацкіх груп і для кожнага дэпутата ў паасобку. Па рабоце дэпо, абменнага пункту, станцыі і іншых вытворчых адзінак можна меркаваць аб тым, як працуе тая ці іншая дэпутацкая група. Да ацэнкі работы дэпутацкіх груп трэба падыходзіць толькі так, бо факты паказваюць, што добрыя дэпутацкія групы ўрасьлі ў вытворчасьць і толькі дрэнныя дэпутацкія групы ня могуць забясьпечыць посьпех вытворчай работы.

ЦВК БССР вызначыў ганаровы сьцяг для лепшага дэпо ў падрыхтоўцы да асеньня-зімовых перавозак. Змагацца за гэты сьцяг павінны дэпутацкія групы, бо сьцяг, атрыманы дэпо, будзе сьцягам і дэпутацкай групы гэтага дэпо.

Адказны час падрыхтоўкі да перавозак патрабуе адказнай работы. У той кароткі час, што застаўся да перавозак, трэба працаваць асабліва напружанымі тэмпамі, каб кожны перавозачны сродак, каб кожная адзінка ўвайшлі ў перавозку падрыхтаванымі і баяздольнымі.



Прыёмка цыстэрны пасьля рамонту

## Шляхам ударнай работы

ГОМЕЛЬ. У сваім рапарце прысьвечаным юбілею ЦО КП(б)Б «Зьвязды» і тыражу газеты «З рашаючы», рабочыя, служачыя і ІТР дэпо Гомель паказваюць на тыя значныя посьпехі, якія здабыты дзякуючы практычнаму ажыцьцяўленьню рашэньняў партыі на транспарце, ажыцьцяўленьню 6 гістарычных умоў тав. Сталіна, загаду тав. Андрэева аб асеньня зімовых перавозках, мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў і выкананьню фінпляну.

За першыя квартал транфінплян выкаканы на 117 проц., за другі квартал —на 110,2 проц. Сярэдняя-сутачны прабег пасажырскіх паравозаў замест 295 клм. па заданьні даведзены да 326 клм, сярэдня-сутачны прабег таварных паравозаў дасягае 209 клм, замест заданьня ў 195 клм. Карысная праца паравозаў складае 11,3 гадзіны.

З 1-га ліпеня да дню адчыненьня тыражу было арганізавана 17 гаспадарчаразьліковых рамонтных брыгад. Сапаборніцтвам і ўдарніцтвам ахоплена 65 проц. рабочых. Падпіска на пазыку «З, рашаючы» па дэпо складае 129.000 руб., замест кантрольнага заданьня ў 125.000 руб. Падпіска на пазыку «4-ты заключны» таксама поўнасьцю ахоплены ўсе рабочыя, служачыя і ІТР дэпо. Кантрольнае заданьне выканана на 122,7 проц.

Па цэхах дэпо арганізаваны брыгады імя юбілею «Зьвязды».

Рабочыя, ІТР і служачыя дэпо Гомель заявілі, што пад кіраўніцтвам партыі яны поўнасьцю падрыхтуюць дэпо да асеньня-зімовых перавозак, дабіўшы поўнага ахопу рабочых ашчадкасамі, мабілізуюць усе наяўныя ўнутраныя рэсурсы і забясьпечаць поўнае і сваячасовае выкананьне трансфінпляну.

Гомельскае дэпо ўзмацняе тэмпы сваёй работы і імкнецца заваяваць права на атрыманьне сьцягу ЦВК БССР.

Б.

## Адказнасьць за падрыхтоўку ляжыць і на дэпутацкіх групах

ВОРША (Наш кар.). Аршанскі чыгуначны вузел дабіўшыся некаторага зруху ў падрыхтоўцы да асеньня-зімовых перавозак, мае яшчэ рад не дахопаў, якія павінны быць неадкладна ліквідаваны, бо яны могуць вельмі шкодна адбіцца на правядзеньні непасрэдных перавозак.

На вузле наглядаецца неўкамплектаванасьць апарату патрэбнымі кадрамі, што яшчэ больш будзе адчувальным пры двухбаковым абмене з Заходняй чыгункай на ст. Ворша.

Будаўніцтва дапаможнай веткі для навалачных грузаў яшчэ ня скончана. Зусім не пачата работа па прадоўжаньні і мэханізацыі сартовачнай рампы на Воршы-Ўсходняй, не пабудавана таксама рампа для пагрузкі і выгрузкі прадуктаў харчаваньня.

Апрача раду іншых недахопаў у падрыхтоўцы шляху да перавозу, нельга ніяк таксама мірыцца з дрэннымі ўзаемаадносінамі паміж чыгункай, саюзтрансам і кліентурай. Зараз яшчэ вельмі часта наглядаюцца выпадкі несвачасовай інформацыі чыгункі аб прыбыўшых грузах. Саюзтранс дрэнна рыхтуецца да асеньня-зімовых перавозак (у яго ёсьць усяго толькі тры аўтомашыны і 13 коняй, якія вельмі змораны).

Яшчэ горш рыхтуецца да перавозак кліентура. Да гэтага часу яшчэ не складзены канкрэтныя пляны па перавозках і таму чыгунка і саюзтранс нічога аб іх ня ведае.

Вялікая віна ва ўсіх гэтых прарывах кладзецца і на бюро транспартнай сэкцыі, на дэпутацкія групы на вузле, якія ніякай падрыхтоўчай работы не праводзяць, не мабілізуюць увагу чыгуначнікаў на пасьпяховую падрыхтоўку да асеньня-зімовых перавозак. Дэпутацкія групы вузла слаба змагаюцца за ганаровы сьцяг ЦВК БССР, прызначаны для лепшага дэпо ў падрыхтоўцы да асеньня-зімовых перавозак.

Прэзыдыум Аршанскага гарсавету, заслухаўшы інфармацыю аб становішчы з падрыхтоўкай да перавозак, вынес пастанову, у якой абвясьціў вымовы намесьніку загадчыка аддзяленьня Белплодгародніны Цітову, загадчыку базы Белкансаюзу Смалякову і намесьніку старшыні арцелі возчыкаў Маркоўчу за апартуністычную недаацэнку падрыхтоўкі да перавозак, нежаданьне працаваць у кантакце з чыгункай і саюзтрансам і няяўку на паседжаньні на гэтым пытаньні.

Гарсавет абавязаў начальніка станцыі тав. Зантовіча зараз жа прыняць усе неабходныя меры да ўкамплекта ваньня Аршанскага вузла патрэбнымі кадрамі; начальніку камунальнага аддзелу чыгункі, гаркамгасу і гаржыльсаюзу даручана праверыць скарыстанне жылплошчы з мэтай прадстаўленьня кватэр для новых работнікаў. Ухвалены мерапрыемствы па дабудове і мэханізацыі сартовачнай рампы, пачатку работ на пабудове рампы для пагрузкі і выгрузкі прадметаў харчаваньня і г. д.

Аўтагрузавы транспарт павінен быць укамплектаваны новымі грузавымі адзінкамі, а тыя машыны, якія ўжо ёсьць, трэба неадкладна адрамантаваць. Гужтранспарт павінен быць даведзены да 20-25 выездаў.

Вызначаныя мерапрыемствы гарсаветам трэба неадкладна ператварыць у жыцьцё. Аршанскі чыгуначны вузел мае ўсе ўмовы для таго, каб ва ўсеўзбраеньні сустрэць усе асеньня-зімовыя перавозкі і па-бальшавіцку правесьці іх.

Х-н.

## Станцыя Рэчыца рыхтуецца дрэнна

РЭЧЫЦА. Станцыя Рэчыца за час асеньня-зімовых перавозак гэтага году павінна прапусьціць 6.961.049 тон грузу. Гэта значыць, на 30 проц. больш, чым у мінулым годзе. А тым часам падрыхтоўка да перавозак не распачата. Мяхоў, брэзэнтаў і інш. тары на станцыі зусім няма, не наладжана сувязь з кліентурай.

Рамонт дамбы і вадакачкі для аховы ад асеньняй паводкі ня зроблены толькі з тэй прычыны, што дарожны майстар Майсеенка не патрабаваў ад раёну асыгнаваных крэдытаў.

На станцыі не ліквідавана абязьлічка. Інструмант не прымацаваны да рабочых, ад чаго бывае часты крадзёж і ломка яго. Запасныя часткі—гайкі, балты, накладкі—на час асеньня-зімовых перавозак не загатоўлены.

З боку адміністрацыі чыгункі і начальніка станцыі Баброўскага наглядаюцца зусім недапушчальныя адносіны да вярбоўкі рабочай сілы. Да гэтага часу яшчэ не заключаны ніводзін дагавор з калгасам на рабочую сілу.

Спакойна да ўсяго гэтага адносіцца і рэчыцкі гарсавет. (БелТА).

## ДАМО 10.000 ТОН ЗБОЖЖА У ЖНІЎНІ

### Склады для прыёмкі збожжа непадрыхтаваны

БАБРУЙСК. (наш. кар.). Перадавыя калгасы раёну правядзеньне ўборкі ўраджаю шчыльна ўвязалі з малацьбою і выкананьнем сваіх абавязкаў перад дзяржаваю па здачы (продажу) таварнай прадукцыі.

У горад прыбылі першыя абозы са збожжам. У адзнаку юбілею «ЗЬВЯЗДЫ» у горад дастаўлена абозамі каля 300 цэнтр. збожжа, таксама адпраўлены эшалён з гародніною пралетарыяту Ленінграду і Менску.

Падвоз збожжа павінен прымусіць загатоўчыя арганізацыі рашуча ўзяцца за падрыхтоўку да прыёму гэтага збожжа. У гэтай галіне працы справы ў Бабруску кепскія. Прыёмка збожжа ад чырвоных абозаў ня была праведзена арганізавана. Яшчэ і да гэтага часу склады «Загатзерне» заняты рознымі арганізацыямі, якія ня гледзячы на хуткі масавы падвоз збожжа не жадаюць аслабяць гэтых складаў. Аб гэтым аслабаненьні складаў у свой час вынес пастанову РВК, але райкантора «Насенавод» і аддзяленьне «Саюзкрупы» ня лічаць абавязковым выканаць гэтай пастановы і надалей займаюць склады.

Прыёмка першага збожжа паказала, што «Загатзерне» не забясьпечана яшчэ ў належнай меры апаратам для правядзеньня прыёмкі, няма належнай колькасьці людзей, якія былі-б добра знаёмы з прыёмкаю збожжа і вызначэньнем яго кандыцыі.

Усё гэтыя факты патрабуюць ад загатоўчых арганізацый рашучага пераключэньня на баявыя тэмпы правядзеньня збожжазагатоўчай кампаніі з тым, каб сустрэць паток у поўным узбраеньні.

А ДАМБРОЎСКІ

## Культурна абслугоўваюць збожжаздатчыкаў

ВОРША. Калгасы раду сельсаветаў у адзнаку 15-гадовага юбілею «Зьвязды» арганізавалі чырвоныя абозы са збожжам. За тры дні да 14-га жніўня ўжо здана на Аршанскі элеватар 355 цнт. збожжа. 9-10 жніўня вуліцы гораду былі запружаны чырвонымі абозамі. Раённыя арганізацыі сустракалі абозы з аркестрам музыкі, а таксама быў праведзены мітынг з удзелам рабочых гораду. Наладжана экскурсія збожжаздатчыкаў на элеватар.

Перадавымі калгасамі па арганізацыі абозаў зьяўляюцца калгасы Пішчалаўскага, Веравейшчынскага, Высоцкага, Яромкаўскага і Кудзейскага сельсаветаў. Па ўсіх калгасах астатніх сельсаветаў таксама падрыхтоўваюцца чырвоныя абозы, якія ў масавым парадку прыбудуць 14-га жніўня.

Для культурнага абслугоўваньня здатчыкаў, дырэкцыя элеватару арганізавала чырвоны куток здатчыкаў, дзе прызапашаны газэты і часопісі. Для хутчэйшага прыёму збожжа, а так сама для паскораньня выпускі квіткоў ТСТ адкрыла ларок для абслугоўваньня здатчыкаў. Неабходна адзначыць, што райспажыўсаюз стаіць у баку ад гэтай справы і не адкрывае ларкоў і не забясьпечвае збожжаздатчыкаў адпаведнымі таварамі. (БелТА).

## Масавы чырвоны абоз

СТАРЫЯ ДАРОГІ. У выніку распрацоўкі пастаноў аб'яднанага ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б, гэтымі днямі па раёне быў арганізаваны масавы чырвоны абоз калгасаў са збожжам новага ўраджаю.

45 калгасаў раёну здалі (прадалі) 364 цнт. збожжа першага абмалоту са цыялістычнага ўраджаю.

Калгас «Сацыялізм» здаў (прадаў) 42 цнт., «Расьсьвет новага жыцьця»—22 цнт., «Новы мір»-17 цнт., «Камінтэрн»-19 цнт., «Шлях Ільліча»—13 цнт., «Камуна»—16 цнт. і г. д.

З чырвонымі сьцягамі і лёзунгамі здавалі калгасьнікі збожжа. Каля пункту «Заготзернё» адбыўся мітынг, у якім прымалі ўдзел да паўтары тысячы калгасьнікаў і аднаасобнікаў-сялян.

На мітынгу калгасьнікі прынялі адозву да ўсіх калгасьнікаў Стара-Дароскага раёну і ўсяе БССР, у якой яны заклікаюць калгасы БССР датэрмінова выканаць пляны збожжазагатовак.

Мікола Шванкоў.

ПАЗЫКУ „4-ГА ЗАВЯРШАЮЧАГА"—У МАСЫ

# Дэпутацкія групы фабрык і заводаў

## адназваюць за 100 проц. рэалізацыю пазыкі ў падшэфным раёне, сельсавеце, калгасе

МЕНСК, САЎНАРКОМУ БССР

### ПРАЛЕТАРЫЯТ ГОМЕЛЮ ЗАПЭЎНІВАЕ ПАРТЫЮ І ЎРАД У ТЫМ, ШТО ПРАРЫЎ НА ВЁСЦЫ БУДЗЕ ЛІКВІДАВАНЫ

Рабочыя заводаў, фабрык, прадстаўнікі калгасаў Гомельшчыны, сабраўшыся на ўрачыстае паседжаньне, прысьвечанае адкрыцьцю 7-га тыражу пазыкі «З рашаючы», перадаюць свае палкае бальшавіцкае прывітаньне.

Гомельшчына з дэкады ў дэкаду, з кварталу ў квартал перавыконвае фінплян. Датэрмінова выкананы фінплян 1931 г. на 105 проц., першага кварталу 1932 г. — на 112 проц., другога кварталу 1932 г.—на 111 проц.

Пазыка «4-га завяршаючага году пяцігодкі» распаўсюджана сярод рабочых і служачых на 101 проц. кантрольнай лічбы з перавыкананьнем месячнай зарплаты амаль, што ўсімі прамысловымі прадпрыемствамі.

Мы запэўніваем партыю і ўрад, што прарыў выкананьня пазыкі па аднаасобным і калгасным сэктары на вёсцы ліквідуем у найкаротшы тэрмін.

Удзелам мільёнаў рабочых фабрык і заводаў, калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў у распаўсюджваньні пазыкі забясьпечым выкананьне задач, пастаўленых XVII партканфэрэнцыяй.

Няхай жыве камуністычная партыя і яе правадыр т. Сталін!

## Разгарнуць падпіску сярод аднаасобнікаў

У Шапатовіцкім сельсавеце, Уваравіцкага раёну, паміж рабочымі, служачымі і калгасьнікамі падпіска праходзіць здавальняюча. Калгасьнікі калгасу «Ударнік пяцігодкі» падпісаліся на пазыку на 3-х тыднёвы заработак. Але зусім дрэнна з рэалізацыяй пазыкі сярод аднаасобнікаў. Парт'ячэйка і сельсавет не мабілізавалі грамадзкасьць вакол гэтага пытаньня. На шмат якіх паселішчах сельсавету не праведзены сходы і масы ня ведаюць сутнасьці новай пазыкі. Студэнты, якія знаходзяцца ў адпачынку, не скарыстоўваюцца для правядзеньня гэтае справы. Складзеныя брыгады пры сельсавеце не працуюць. Абраныя камісіі садзейнасьці ў большасьці бязьдзейнічаюць. Сельсавет і партячэйка ня кіруюць гэтай справай. Толькі шляхам растлумачальнай работы, шляхам разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва магчыма забясьпечыць рэалізацыю пазыкі ў самы кароткі тэрмін.

Грак.

## Баброўнік заклікаць да парадку

Рэалізацыя пазыкі «4-га завяршаючага» па Жавінецкім сельсавеце, Глускага раёну, праходзіць надзвычайна марудным тэмпамі, за што сельсавет узнагародзілі ордэнам чарапахі. Кантрольнае заданьне выканана толькі на 11,5 проц. Апартуністычыя тэмпы тлумачацца голым адміністраваньнем з боку старшыні сельсавету Баброўніка і адсутнасьцю ўсялякай растлумачальнай работы. У час правядзеньня сходу, на якім стаяла пытаньне аб рэалізацыі пазыкі, Баброўнік заявіў: «Калі ня хочаце падпісацца па сваёй волі, дык падпішацеся няволяю».

Кіраўніцтва раёну павінна рашуча ўдарыць па «лявацкіх» загібах і ўсякіх скажэньнях дырэктыў партыі і ўраду—замене добраахвотнасьці голым адміністраваньнем. Вінаватыя ў парушэньні прынцыпу добраахвотнасьці павінны прыцягвацца да суровай адказнасьці.

Свой.

## Зводка

па рэалізацыі пазыкі «4-га завяршаючага году пяцігодкі» па даных Наркамфіну БССР на 10 жніўня 1932 году

Плян сярод рабочых, служачых і неарганізаванага насельніцтва гораду выкананы на 90,8 проц.

Па калгасным сэктары—62,5 проц.

Сярод аднаасобнікаў за гатоўку грашыма—2,7 проц.

Разам па БССР па ўсіх групах—72,3 проц.

ІДУЦЬ НАПЕРАДЗЕ:

Жыткавіцкі раён 115,3 проц.
Дзяржынскі 108,9 проц.
Заслаўскі 108,5 проц.

НАБЛІЖАЮЦЦА ДА ВЫКАНАНЬНЯ:

Дрысенскі 98,8 проц.
Менскі 97,5 проц.
Аршанскі 94,1 проц.

АДСТАЮЦЬ У РЭАЛІЗАЦЫІ ПАЗЫКІ:

Шклоўскі 63,2 проц.
Крычаўскі 62,4 проц.
Смалявіцкі 59,8 проц.

ГАНЕБНА ПЛЯТУЦЦА Ў ХВАСЬЦЕ:

Чавускі 33,7 проц.
Бешанковіцкі 35,1 проц.
Гарадоцкі 38,8 проц.

## Завод імя Ланцуцкага выканаў плян на 118 проц.

ГОМЕЛЬ. Ад імя 2500 рабочых, ІТР і служачых заводу імя Ланцуцкага рабочы Чыромскі рапартаваў тыражнай камісіі аб поўным выкананьні заданьня па рэалізацыі пазыкі «4-га ЗАВЯРШАЮЧАГА». Работа праведзена ў тры дні, заданьне выканана на 118 проц. Завод шырока ўжывае мэтад пасылкі буксірных брыгад на дапамогу адстаючым прадпрыемствам, падшэфным сельсаветам, саўгасам і калгасам.

ГАРОДНІНУ І БУЛЬБУ МАСКВЕ, ЛЕНІНГРАДУ І ПРАЛЕТАРСКІМ ЦЭНТРАМ БССР

# Арганізуем камсамольскі кантроль

## НАД СЬЛЕДВАНЬНЕМ ВАГОНАЎ З ГАРОДНІНАЙ

15 жніўня

Пералому ў ходзе загатовак гародніны няма. Асноўны тормаз пасьпяховага завозу гародніны ў пралетарскія цэнтры БССР і СССР—затрымка адгрузкі яе на чыгуначных вузлох. Загад НКШЗ аб руху вагонаў з гароднінай ня менш як 400 клм. у суткі яшчэ ня выконваецца.

Таму зараз перад чыгуначнымі арганізацыямі стаіць задача тэрмінова выканаць загад НКШЗ. Гэтаму ў першую чаргу абавязаны дапамагчы камсамольскія арганізацыі чыгуначных вузлоў. Заклік маскоўскага камсамолу да камсамолу БССР аб кантролі над рухам вагонаў з гароднінай для пралетарскіх цэнтраў павінен быць выкананы. На важнейшых чыгуначных вузлох—Жлобін, Віцебск, Гомель—трэба зараз-жа стварыць ударныя камсамольскія брыгады, якія-б сачылі за сьледваньнем вагонаў з гароднінай. Ніводнай мінуты прастою вагону з гароднінай. Ніводнага кілё, цэнтнера гародніны не павінна быць папсавана. 400 кілёмэтраў у суткі—такі шлях руху гародніны.

### Завоз плодагародніны ў Менск, Віцебск і Гомель (у тонах) 12-13 жніўня 1932 г.

| | Бульба | Гародніна | Ягады | Садавіна |
|---|---|---|---|---|
| Менск | 28,4 | 41,1 | 0,4 | 4,5 |
| Віцебск | — | 15 | — | 1 |
| Гомель | 6 | 19 | — | — |

13 жніўня адгружана (у тонах):

| | Бульбы | Гародніны | Гуркі |
|---|---|---|---|
| Ленінграду | 51,2 | 95 | |
| Маскве | — | | 3,1 |

## У Бабруйску не падрыхтаваны да апрацоўкі і хаваньня гародніны

Бабруйск. (Наш карэспандэнт). Плодагародная кампанія мінулага году мела рад значных прарываў і недахопаў. Галоўнымі з іх зьяўляліся—несвачасовая падрыхтаванасьць арганізацыі да квашаньня і пасолу гародніны і недахоп тары. У выніку—значная частка прадукцыі папсавалася.

Аддзяленьне Белплодгародніны, якое да рэчы і ў мінулым годзе праваліла гэту справу, да гэтага часу палец аб палец ня ўдарыла для забясьпечаньня пасолу і квашаньня гародніны таваю, ня гледзячы на тое, што ў бягучым годзе трэба пасаліць і заквасіць ня менш 400 тон капусты, 200 тон гуркоў і г. д. Кіраўнікі райканторы не патурбаваліся аб набыцьці чанаў, бочак. Час пасолкі гуркоў наступіў і ў чым будзе яе праводзіць райкантора Белплодагародніны—невядома.

Не адстае ад Белплодагародніны аддзяленьне Белгандлю. Яно яшчэ нават і ня думае аб пасоле і квашаньні гародніны.

Гэта непадрыхтаванасьць да пасолачнай кампаніі мае ў сваім выніку тое, што прадукты (гуркі) ўжо пачынаюць псавацца. Цэрабкоп адмаўляецца ад прыёмкі гуркоў ад калгасаў. Меў месца такі факт, калі некалькі тон гуркоў ляжалі ссыпанымі ў кучу каля шасэ з тае прычыны, што іх ніхто ня прыняў.

Горад павінен мець усю зіму квашаную і сьвежую капусту, салёныя гуркі, памідоры, сьвежую бульбу і садавіну. Гэтае патрабаваньне павінна быць выканана.

А. Дамброўскі.

# Сучаснае становішча ў Германіі і антыфашысцкая кампанія кампартыі Германіі

РЫФ

(Артыкул спэцыяльна для „Савецкай Беларусі")

Дзяржаўны пераварот, які зрабіў урад фон-Папэна 20 ліпеня 1932 г., ясна асьвятляе сучаснае становішча ў Германіі і паказвае, якімі нячуванымі тэмпамі ідзе наперад фашызацыя ўраду фінансавага капіталу, буйных землеўласьнікаў і дваран. Зьмяшчэньне сацыял-дэмакратычнага міністра ў прускім урадзе, выдаленьне вялікага ліку сацыял-дэмакратычных і рэспубліканскіх дзяржаўных чыноўнікаў з паліцыі і адміністрацыі, абвяшчэньне ваеннага палажэньня ў Берліне—Брандэнбургу, забарона дэманстрацый у цэлай дзяржаве і, у першую чаргу, мерапрыемствы супроць камуністычнай партыі—паказваюць, што ўрад фон-Папэна зьяўляецца кіраўніцтвам непасрэднага ўстанаўленьня яўнай фашысцкай дыктатуры. На базысе ўсё большага паглыбленьня гаспадарчага крызісу і стварэньня, дзякуючы гэтаму Лёзане, зьнешняпалітычнага становішча, нямецкая буржуазія шукае паратунку ў фашысцкай бязьлітаснасьці ў дачыненьні да нямецкага пралетарыяту і яго кіраўніцтва—кампартыі Германіі.

Надзвычайныя дэкрэты, што выданы ўрадам фон-Папэна, ад першага да апошняга, значаць ня што іншае, як наступ на жыцьцёвы ўзровень пралетарыяту, яго актыўных пластоў, а ўрэшце меры і поўнае скасаваньне мінімальных рэшткаў палітычных правоў рабочае класы.

Скасаваньне сацыяльнага страхаваньня, моцныя ўдары па страхаваньні беспрацоўных, дзяржаўная пастанова аб зьніжэньні заробнай платы па памяці усіх галінах прамысловасьці—усё гэта выразная адзнака канцэнтраванага наступу фінансавага капіталу на рабочую класу.

Пералельна з наступам на жыцьцёвы ўзровень германскай рабочай класы буржуазія ўжывае фашысцкі тэрор, які павялічваецца в кожным днём. З таго часу, як кіраўніцтва фон-Папэна легалізавала фашысцкія вайсковыя арганізацыі і штурмавыя атрады Гітлера, па ўсёй Германіі забіта бандамі Гітлера 147 рабочых і 1725 ранена.

У адну толькі нядзелю (17 ліпеня г. г.) забіта 19 рабочых і ранена 285. Побач з гэтым жудасным тэрорам з боку нацыянал-сацыялістычных штурмавых атрадаў, лютае яшчэ цесна зьвязаны з ім афіцыйны паліцэйскі тэрор, а ў апошні час таксама і тэрор рэйхсвэру.

Разам з узяцьцем у свае рукі паліцэйскай улады ў Прусіі генэраламі рэйхсвэру ўсё больш і больш ажыцьцяўляецца патрабаваньне нацыянал-сацыялістычнага кіраўніцтва забараніць камуністычную партыю. Начальнік паліцыі генэрал Рундштэт выдаў процізабастовачны і процізбройны дэкрэт. Цяпер кожны вусны або пісьмовы заклік да ўсеагульнай забастоўкі будзе ўжо лічыцца парушэньнем надзвычайнага дэкрэту і над вінаватымі ў гэтым, гэта значыць, над рэвалюцыйнай рабочай класай павісла пагроза цяжкіх турэмных зьняволеньняў і нават пакараньняў сьмерцю.

Калі германская буржуазія не забараніла яшчэ камуністычнай партыі, дык толькі таму, што асобныя групы буржуазіі яшчэ ня маюць яснага ўяўленьня аб абраным шляху і яго дэталях. А таксама—дзякуючы таму, што ўсё больш і больш шырокія масы пурэтуюцца вакол кампартыі і яе кіраўніцтва для антыфашысцкай кампаніі, для рашучай самаабароны і контр-наступу. Але-ж, не зважаючы на гэта, забарона кампартыі шалёна падрыхтоўваецца і, як можна спадзявацца, загад аб гэтым будзе выданы пасьля выбараў.

ЦК германскай кампартыі характарызаваў урад фон-Папэна, як урад непасрэднага ўстанаўленьня фашысцкай дыктатуры. Гэта характарыстыка цалкам пацьвердзілася. З першых-жа дзён існаваньня ўраду фон-Папэна партыя заклікала рабочую класу і шырокія актыўныя масы гораду і вёскі да антыфашысцкай барацьбы, да барацьбы супроць голаду, фашызму і падрыхтоўкі да імпэрыялістычнай вайны. Пад кіраўніцтвам кампартыі па ўсёй краіне—на прадпрыемствах, па ўстановах, у гарадох і на вёсцы, а так сама ў вялікай колькасьці прафсаюзных арганізацый—стварэцца камітэты адзінага антыфашысцкага фронту па барацьбе з фашызмам.

Сярод шырокіх мас сацыял-дэмакратычных рабочых, не зважаючы на сабатаж сацыял-дэмакратычных кіраўнікоў, ёсьць моцнае жаданьне і імкненьне да адзінага чырвонага фронту, да супольнай барацьбы плячо ў плячо з камуністычнымі рабочымі. На ўсіх вусастках барацьбы рабочае класы масы ўзьняты на абарону свайго існаваньня і здабытых імі з бою палітычных правоў. Супроць жудаснага тэрору нацыянал-сацыялістаў нарастае шырокая антыфашысцкая хваля на прадпрыемствах, ва ўстановах і на вуліцах. У Вупэрштале, цэнтры антыфашысцкага германскага руху, барацьба супроць фашызму і супроць ураду фон-Папэна набыла самыя шырокія разьмеры. Так, а таксама ў Рурскай вобласьці, антыфашысцкая кампанія ахапіла прадпрыемствы і набыла сабе шырокі масавы базіс. Забастоўкі супроць зьніжэньня зарплаты, супроць зьніжэньня дапамог, супроць пляновых фашысцкіх выступленьняў, і раўналежна за звальненьне нацыянал-сацыялістычных забойцаў з прадпрыемстваў становіцца ўсё больш і больш частымі. Камуністычная фракцыя рэйхстагу выдала камунікат аб дзяржаўным перавароце фон-Папэна і заклікае масы да ўсеагульнай забастоўкі супроць фашысцкага надзвычайнага палажэньня. Партыя характарызуе наступ ураду фон-Папэна на Прусію, прыняцьце на сябе паліцэйскай улады рэйхсвэрам і надзвычайнае палажэньне супроць рабочай класы, як уступ, першы крок, да яшчэ больш вострага ўдару па правадыру, антыфашысцкай кампаніі—па кампартыі. Надзвычайныя суды, папярэднія арышты камуністычнага актыву, адабраньне ўсіх партыйных дамоў, забарона камуністычнай прэсы—зьяўляюцца мэтай барацьбы ўраду фон-Папэна супроць рэвалюцыйнага пралетарыяту. Партыя заклікае рабочую класу да ўсеагульнай забастоўкі, да барацьбы супроць навісшага над краінай адкрытага ўстанаўленьня фашысцкай ваеннай дыктатуры і гаворыць:

«Цяпер трэба арганізаваць усеагульную палітычную забастоўку непасрэдна і адразу на ўсіх прадпрыемствах».

* * *

Сацыял-дэмакратычная партыя, якая, як і раней, зьяўляецца галоўнай сацыяльнай апорай буржуазіі, рабіла спробы давесьці масам, што ўрад фон-Папена, да якога яна ставіцца нібыта апазыцыйна, ёсьць урад найменшага зла. У прыватнасьці, сацыял-дэмакратычная партыя стаяла за поўную згоду з унутры-палітычнай лініяй ураду фон-Папена, з пазыцыяй германскай дэлегацыі ў Лёзане. Усе неаднаразова сацыял-дэмакратыя, супольна з рэфармісцкімі прафсаюзнымі правадырамі, прапанавала ўраду фон-Папена сваё адкрытае падтрыманьне. Галоўнае кіраўніцтва сацыял-дэмакратычнай партыі Германіі (СПГ) ужыло ўсе захады дзеля таго, каб нарастаючы чырвоны адзіны фронт рабочай класы сябатаваць і чыніць яму перашкоды. Супроць бурных патрабаваньняў сацыял-дэмакратычных рабочых, галоўнае кіраўніцтва СПГ ужывае адно адульнае мерапрыемства, а іменна—пагражае выключэньнем з партыі за кожнае супольнае выступленьне з камуністычнымі рабочымі. СПГ ставіць умовай стварэньня сваясаблівага, на яе разуменьне, «адзінага фронту»—блёк СПГ і КПГ (сац.-дэм. партыі Германіі і кампартыі Германіі) на тэй умове, што камуністычная партыя адмовіцца ад усялякай, якое-б там ні было, крытыкі сацыял-дэмакратыі. На дзяржаўны пераварот ураду фон-Папэна сацыял-дэмакратыя адказвае новым хлусьлівым манэўрам. Яны заклікала масы да захаваньня да 31 ліпеня «спакою і парадку» т. зн. да ўстрыманьня да дню выбараў ад усялякіх выступленьняў. Сацыял-дэмакратыя абагадзейвае масы пастанаўленьнем дзяржаўнага трыбуналу, які быў скліканы адстаўленым Прускім урадам.

Сацыял-дэмакратыя перашкаджае ўсюды, дзе яшчэ яна ў моцы, усякаму бляваму і забастовачнаму руху рабочай класы супроць фашысцкай дыктатуры. Супроць фашысцкіх выступленьняў яна дае лёзунг—аддаць вуліцы фашыстам, а самім выйсьці за горад, на вольнае паветра і пляжы. У мясцовасьцях і прадпрыемствах, дзе ніжэйшыя сацыял-дэмакратычныя актывісты з уласных перакананьняў прымалі ўдзел у аднадушных выступленьнях камуністычных рабочых атрымалі прапанову ад сацыял-дэмакратычных акруговых камітэтаў выйсьці з камітэтаў адзінага антыфашысцкага фронту. Членам саюзаў, якімі кіруюць сацыял-дэмакраты, забаронен усякі ўдзел у антыфашысцкай кампаніі, якую наладжвае кампартыя. Сапраўдным адзіным фронтам няхай будзе «жалезны фронт», да якога належыць сацыял-дэмакратычная партыя, рэфармісцкія прафсаюзы, сацыял-дэмакратычныя спартыўныя таварыствы і рэшта арганізацый, якія знаходзяцца пад уплывам СПГ (сац.-дэм. партыі Германіі)—вось іх установка.

* * *

Нацыянал-сацыялісты разам з сваёй масавай партыяй і арміяй грамадзянскай вайны, зьяўляючыся непасрэднай апорай ураду фон-Папэна, спрабавалі выказаць нібыта апазіцыю да гэтага ўраду,—з прычыны рэзультатаў Лёзанскай канфэрэнцыі. З мэтай ашуканства мас, яны паставілі міністру ўнутраных спраў ураду фон-Папэна такія ўмовы і патрабаваньні, якія той павінен быў адкінуць і гэта дало магчымасьць нацыянал-фашыстам знадворна матываваць перад маласпакушонымі ў палітыцы людзьмі сваю псэўда-апазіцыю супроць далейшага прычынчаньня нямецкага народу Лёзанскай згодай. Нацыянал-сацыялісты вітаюць дзяржаўны пераварот ураду фон-Папэна і характарызуюць яго, як першы крок да зьнішчэньня рэвалюцыйнага пралетарыяту і яго правадыра—кампартыі. З прычыны адстаўкі Прускага ўраду, быў зроблен першы крок да ліквідацыі лістападаўскай рэспублікі, каб пасьля зрабіць другі крок праз дзейнасьць нацыянал-сацыялістычнага ўраду да канчатковай ліквідацыі лістападаўскай рэспублікі і скасаваньне кампартыі. Нацыянал-сацыялісты адкрыта патрабуюць забароны кампартыі і пагражаюць афіцыяльным узброеньнем сваіх штурмавых атрадаў для разгрому рэвалюцыйнага пралетарыяту.

Сацыял-рабочая партыя і брандлеры яны, таксама як і трацкісты, зьяўляюцца пры сучаснай сытуацыі самай удалай агентурай клясавага ворага сярод п

# ЗА ГРАНІЦАЙ

## Перагаворы аб утварэньні новага германскага ўраду

### Торг за партфэлі ў разгары

**БЭРЛІН. 13-VIII.** Сёньня адбылася гутарка **Гітлера з Шлейхэрам**, пасьля якой пасьледавала гутарка Гітлера з рэйхсканцлерам фон-Папэнам.

Як паведамляе друк, перагаворы, якія адбыліся сёньня паміж Гітлерам і членамі ўраду аб рэарганізацыі габінэту, закончыліся бяз ніякіх вынікаў. Гітлер высунуў патрабаваньне нацыянал-сацыялістаў аб тым, каб ім было перадано ня толькі кіраўніцтва габінэтам, але і рашаючыя пасады ва ўрадзе, і адхіліў зробленыя яму прапановы.

## Гіндэнбург адхіліў патрабаваньні Гітлера

**БЭРЛІН. 13-VIII.** Агенцтва «Вольф» паведамляе, што перагаворы паміж прэзыдэнтам Гіндэнбургам і Гітлерам закончыліся безрэзультатна.

**БЭРЛІН, 13-VIII.** Агенцтва «Конці» паведамляе падрабязнасьці аб закончыўшыхся бяз вынікаў, перагаворах паміж прэзыдэнтам Гіндэнбургам і Гітлерам.

Перагаворы працягваліся каля 20 мінут. Прэзыдэнт запрапанаваў Гітлеру ўвайсьці ў агульна-германскі ўрад або вылучыць у склад ўраду некаторых прадстаўнікоў з нацыянал-сацыялістычнай партыі.

Гітлер са свайго боку патрабаваў перадачы дзяржаўнай улады ў рукі нацыянал-сацыялістаў. Патрабаваньне Гітлера адхілена Гіндэнбургам, які заявіў, што ён ня можа ўзяць на сябе адказнасьці за выкананьне патрабаваньня нацыянал-сацыялістаў.

## Буржуазія не давярае Гітлеру

**БЭРЛІН, 13-VIII.** Левая Вэльт-Ам Абэнд раскрывае закулісныя камбінацыі, якія выклікалі супраціўленьне ўраду супроць меркаванага і ўжо вырашанага назначэньня Гітлера на пасаду рэйхсканцлера.

Зусім няправільна, — піша «Дэйч-Ам-Абэнд», што гэта супраціўленьне было выклікана катэгарычнай адмовай Гіндэнбурга. Рашучую ролю адыграў погляд прамысловага і біржавога капіталу. Прамысловы і біржавы капітал лічаць, што Гітлер і Зэвэрынг поўнасьцю падыходзяць для пасады рэйхсканцлера і міністра ўнутраных спраў, таму што яны карыстаюцца поўным давер'ем банкіраў і прамыслоўцаў, але назначэньне іх на гэтыя пасады можа адбыцца толькі пры тэй умове, калі яны, пад націскам штурмовых атрадаў, ня ўжывуць якіх-небудзь гвалтоўных мерапрыемстваў.

Прамыслоўцы катэгарычна патрабуюць рашучага працягваньня палітыкі надзвычайных дэкрэтаў Брунінга і фон-Папэна.

## Друк лічыць магчымым кааліцыйны ўрад

**БЭРЛІН, 12-8.** Ня гледзячы на няяснасьць рэзультатаў перагавораў Гіндэнбурга і фон-Папэна з прадстаўнікамі партыі цэнтру, нацыянал-сацыялістаў і нацыяналістаў, найбольш магчымым, паводле зьвестак германскай прэсы, лічыцца стварэньне каліцыйнага ўраду нацыянал-сацыялістаў і партыі цэнтру.

**ПАДРЫХТОЎКА ДА ЗАБАРОНЫ КАМПАРТЫІ Ў РАЗГАРЫ**

## Ганебны правал паліцэйскіх пошукаў „юрыдычных" матываў да загнаньня кампартыі ў падполье

**БЭРЛІН, 13-VIII.** Сёньня паліцыя вымушана паведаміць, што вобыскі, зробленыя ёй ўчора ў Бэрліне ў памяшканьнях кіраўнічых органаў кампартыі скончыліся бяз вынікаў. Канфіскаваны паліцыяй матар'ял не дае юрыдычнае падставы для распачацьця справы супроць кампартыі.

Зьвесткі аб гэтых вобысках, якія ўчора адбываліся па ўсёй Германіі як у памяшканьнях кампартыі, так і ў кватэрах паасобных работнікаў партыі, выклікалі глыбокае абурэньне сярод працоўных мас. У Бэрліне ўчора ў радзе бірж працы і заводаў патрыманьні зьвестак аб вобысках рабочыя склікалі сходы, на якіх былі прыняты рэзалюцыі пратэсту. У часе вобыску ў памяшканьні развалюцыйнай прафапазіцыі перад яе будынкам сабралася рабочая дэманстрацыя пратэсту.

Апрача вобыскаў у Бэрліне, Гамбургу, Кенігсбэргу, Кельне, аб якіх ужо павядамлялася, паліцыя зрабіла таксама вобыскі ў партыйных камітэтах і ў кватэрах камуністаў, у гарадох Глодбах-Рэйдтэ, Кобленцы, Магдэбургу і Крайфэльдэ.

У Глодбах-Рэйдтэ вобыскі былі зроблены ў 24 кватэрах камуністаў. У Кобленцы вобыскі адбываліся апрача памяшканьня камітэту кампартыі, таксама ў антыфашысцкіх камітэтах і камітэтах рэвалюцыйнай прафапазіцыі.

### Падрабязнасьці вобыску ў доме К. Лібкнэхта

**БЭРЛІН, 13-VIII.** Сёньня «Ротэ-Фонэ» паведамляе падрабязнасьці аб учарайшых паліцэйскіх вобысках у памяшканьні ЦК германскай кампартыі і ў памяшканьнях іншых арганізацый. Учора ў поўдзень паліцыя абкружыла дом імя К. Лібкнэхта, дзе знаходзіцца ЦК кампартыі, а таксама рэдакцыя і друкарня «Ротэ-Фонэ» зрабіла вобыск ва ўсіх памяшканьнях дому. Вобыск цягнуўся каля дзьвюх гадзін і не дал ніякіх рэзультатаў.

Адначасова быў зроблены вобыск у памяшканьнях кіраўніцтва рабочых фізкультурнікаў і МОПР'у. Пры вобыску ў памяшканьні кіраўніцтва рэвалюцыйнай прафапазіцыі і Саюзу барацьбы супроць фашызму паліцыя забрала старыя абежнікі і брашуры.

### Забарона кампартыі—„неадкладная неабходнасьць капіталістаў"

**БЭРЛІН, 13-VIII.** Орган буйных германскіх прамыслоўцаў «Дэйчэ-Цэйтунг» у сувязі са зробленымі ўчора ў Бэрліне і ў многіх гарадох Германіі вобыскамі ў памяшканьнях мясцовых камітэтаў кампартыі і рэвалюцыйных масавых арганізацый, піша: «Вялікі рост галасоў кампартыі ў апошніх парламэнцкіх выбарах не пакідае сумніву аб неабходнасьці рашуча працягваць пачаты шлях. Роспуск германскай кампартыі разам з усімі яе арганізацыямі ва ўсегерманскім масштабе і анулываньне камуністычных мандатаў у рэйхстагу і ляндтагах зьяўляюцца неадкладнай неабходнасьцю.

## Савецка-японская рыбалоўная згода

**МАСКВА, 14.8.** На працягу апошніх 1½ год паміж намесьнікам наркому па замежных справах СССР тав. **Карахаам** і надзвычайным паўнамоцным паслом Японіі **Кокі Хірста** вяліся перагаворы па рыбалоўных пытаньнях.

У сучасны момант гэтыя перагаворы пасьпяхова закончаны і ўчора (13 жніўня) а 9 гадзіне ўвечары адбылося падпісаньне спэцыяльнай згоды, якая ўключае вырашэньне асноўных спрэчных пытаньняў, зьвязаных з ужываньнем рыбалоўнай канвэнцыі, заключанай паміж СССР і Японіяй у 1928 годзе.

З боку СССР згоду падпісаў намесьнік наркому па замежных справах тав. **Карахан**, а з боку Японіі—надзвычайны паўнамоцны пасол **Кокі Хірста**.

Пры падпісаньні згоды прысутнічалі адказныя чыны японскага пасольства і адказныя работнікі Народнага Камісарыяту Замежных Спраў.

## Савецкія экспэрты ў Турцыі

**СТАМБУЛ, 12-8.** У Стамбул прыехалі савецкія экспэрты па пытаньнях прамысловага будаўніцтва. Прыехаўшых спэцыялістаў спатыкалі прадстаўнікі міністэрства народнае гаспадаркі і паўпрэд СССР у Турцыі тав. **Сурыц**.

Сёньня адбудзецца прыём экспэртаў прэм'ер-міністрам Ісмэт **Пашой**, які для гэтага прыёму спэцыяльна прыяжджае з **Яловы**.

**У фашысцкай Польшчы**

## Сялянства адмаўляецца плаціць падаткі

**ВАРШАВА, 12-8.** Учора ў вёсцы Быстрэ каля гораду **Новы Сонч** (Кракаўскае ваяводзтва) адбыліся буйныя сутычкі сялян з паліцыяй у сувязі з адмовай сялян плаціць страхавыя надоймкі па прымусовым страхаваньні маемасьці.

Калі прыбыўшы ў вёску судовы выканаўца спрабаваў адабраць за няўплату колы ў аднаго селяніна, дык сяляне натоўпам аказалі актыўнае супраціўленьне. Выкліканы паліцэйскі атрад спрабаваў разагнаць сялян. У адказ на гэта натоўп закідаў паліцыю каменьнямі. Адзін паліцэйскі паранены. Хутка пасьля гэтага прыбылі новыя паліцэйскія падмацаваньні. Сяляне былі разагнаны. Адбыліся масавыя арышты.

## Японія рыхтуецца да прызнаньня Манчжурыі

**ТОКІЕ, 13-8.** Па зьвестках агенства «Сімбун-Рэнго» савет міністраў учора вырашыў, што надышоў час прызнаньня Манчжурскай дзяржавы. Тэрмін павінен быць вызначаны ў залежнасьці ад тае змены палажэньня, якую дасьць Муто (назначаны паўнамочным прадстаўніком Японіі ў Манчжурыі).

Вайсковая ўлада лічыць, што прызнаньне ня можа адбыцца пасьля скліканьня парляманту і адбудзецца ў палове верасьня напярэдадні пленарнага паседжаньня Лігі Нацый.

Уцыда (міністар замежных спраў) у інтэрв'ю з прадстаўнікамі прэсы пасьля паседжаньня савету міністраў заявіў: прызнаньне наступіць па скончэньні неабходных падрыхтоўчых захадаў. Ажыцьцяўленьне падрыхтоўчых захадаў перадана міністру замежных спраў.

## Кітайска-тыбэцкая вайна

**ШАНХАЙ. 13-8.** Паводле паведамленьня «Цэнтраль Нью Эджансі», кітайскае войска заняло Дэгэ на поўначы Чуньбяня (асобная акруга Кітаю на граніцы з Тыбэтам). Паводле слоў агенцтва, кітайскае войска адабрала назад тэрыторыю, якая была акупавана ў 1918 годзе тыбэцкім войскам.

Агенцтва вазначае, што тыбэцкае войска канцэнтруецца ў раёне Чаньду (на паўднёвы ўсход ад Жэхэ) і рыхтуецца пад кіраўніцтвам Далай-Ламы да контр-атакі.

## Байкот японскіх тавараў у Шанхаі пашыраецца

**ШАНХАЙ, 13-8.** Шанхайская гільдыя купцоў прыняла пастанову аб спыненьні гандлю японскімі таварамі.

Кітайская асацыяцыя гарадоў патрабавала ад асацыяцыі параходных кампаній неадкладна спыніць ужываньне японскага вугалю для апалу параходаў.

Асацыяцыя ўласьнікаў транспарту абавязалася і ў далейшым не перавозіць японскіх тавараў. Такія-ж пастановы прынялі і іншыя гандлёвыя арганізацыі Шанхаю.

**УСЕБЕЛАРУСКІ КОНКУРС НА ЛЕПШУЮ ПАДРЫХТОЎКУ ДА НАВУЧАЛЬНАГА ГОДУ**

# ШЫРЫЦЬ РАДЫ УДЗЕЛЬНІКАЎ КОНКУРСУ

## Па-баявому змагацца за рэалізацыю дырэктыў ЦК партыі аб школе

### Гомельшчына дагэтуль не адказала на выклік Менску

## Па-баявому рыхтуюцца да „Дню вучобы"

**ЛЮБАНЬ.** (А нашага спэцкора). У мінулым годзе «Савецкая Беларусь» адзначыла на сваіх старонках Любаншчыну, як раён дрэнная падрыхтоўкі да новага навучальнага году. Сёлета, у выніку зьмены кіраўніцтва і рашучай перабудовы ўсёй работы РайАНА, мы маем у Любаньскім раёне значны зрух у бок практычнага ажыцьцяўленьня дырэктыў партыі аб сярэдняй і пачатковай школе.

У гэтым годзе ў раёне павінны быць адкрыты 10 камплектаў школ другога канцэнтру. Зараз у Ямінскім, Рэдкаўскім і Тальокім сельсаветах ідзе прыстасаваньне будынкаў для гэтых школ, узмацняюцца тэмпы рамонту і пабудовы новых у іншых мясцовасьцях раёну. Да 1-га верасьня будзе скончана будаўніцтва Дуброўскай, Касьцюкоўскай і Камунарскай ШКМ (а таксама Юшкаўскай і Саўгаскай), да 15-га верасьня будзе гатова Любаньская ШКМ.

У мэтах падрыхтоўкі пэдагагічных кадраў для новаадкрываемых школ II канцэнтру, РайАНА паслала 15 настаўнікаў на курсы перападрыхтоўкі ў Менск, Слуцак і Віцебск. Падручнікі для школ, паводле своячасова зробленага заказу, ужо часткова паступілі ў РайАНА.

Пры РайАНА існуе майстэрня, якая вырабляе абсталяваньне (шафы, слонцы і г. д. Абсталяваньнем усе школы раёну будуць забясьпечаны поўнасьцю. Некаторыя з іх—напрыклад, Юшкаўская, Рэдкаўская—ужо забралі на лежнае ім абсталяваньне.

Асаблівая ўвага ўсёй настаўніцкай грамадзкасьці была завострана сёлета на пытаньнях разгортваньня палітэхнічнай працы. Рабочыя пакоі і майстэрні ёсьць цяпер пры ўсіх ШКМ, толькі дзе нідзе ў адпаўкамплектных школах замест майстэрняў і пакоў—рабочыя куткі.

Розных прылад для палітэхнічнай асьветы набыта сёлета звыш 4500 руб.

Паасобныя настаўнікі раёну паказваюць прыклад і ўзор добрасумленай падрыхтоўкі сваіх школ да новага навучальнага году. Так, камсамолка-настаўніца т. Турова—з Тураўскай школы вярнуўшыся раней тэрміну з адпачынку, па-ўдарнаму ўзялася за рамонт школьнага будынку, клапоціцца пра набыцьцё прылад, падручнікаў і іншых дапаможнікаў.

Але побач з вялікімі дасягненьнямі ёсьць і факты абураючай нядбайнасьці, да задач школьнага будаўніцтва. Рэчанскі і Юшкаўскі сельсаветы, напрыклад, не перавялі з сваіх бюджэтаў ніводнага рубля на палітэхнізацыю і навучальную частку сваіх школ; «з-за недахопу рабочае сілы» (звычайная адпіска) зрываецца будаваньне Рэчанскай ШКМ; з настаўніцкіх кадраў на ўвесь раён ня ніводнага выкладчыка з вышэйшай асьветай.

Юр. Лявонны.

## Панласьці канец злачыннай агіднасьці

### Чакаем адказу. ад Караўлянскага райкому партыі

У Акопскім нацыянальным Украінскім сельсавеце, Караўлянскага раёну, яшчэ ў 1930 годзе распачата пабудова школы. У тым-жа 1930 г. былі выведзены сьцены, пастаўлена палова крокваў, пасьлена чорная падлога і столь, асаджаны ў дзьвярох і вокнах, нарэзаны дошкі у патрэбнай колькасьці і пад рыхтован астатні будматар'ял. У такім становішчы, бяз даху, будынак школы прастаяў дзьве зімы (1930—1931 і 1931—1932 г.). Сьцены знадворку і знутры парасьлі грыбамі, чорная падлога і столь мясцамі паперавальваліся, папе рагніваўшы пад кучамі сьмецьця і трэсак. Дошкі для скончэньня школы і на мэблю складзены як папала пад адкрытым небам, пакасіліся, пакалоліся і зарасьлі грыбамі.

Караўлянскі райвыканком: Кал-ж ты, нябожчыца, пабудуеш нам школу?

Хоць тут-жа на месцы ёсьць дастатковая колькасьць апоўкаў, сьцены, вуглы будынку і дошкі,—імі накрыты ня былі.

Райвыканком на працягу 2-х год ніякіх захадаў да скончэньня школы ня ўжываў. Райвыканком спадзяецца, што школу скончыць былая Мазырская акруговая буднкантора, якая яе пачынала будаваць і якой ужо 2 гады ня існуе на белым сьвеце.

Калі будынак ня будзе скончан да восені, дык на-лета кавчань яго будзе ужо немэтазгодна, бо ён зусім згніе.

У Акопскім сельсавеце няма ніводнага ўласнага школьнага памяшканьня. Адчыненая там ШКМ, ужо у гэтым навучальным годзе будзе мець поўных 7 груп. Летась 6 груп займаліся у сялянскіх хатах па 6-ці раскіданых асобных хутарох. Прадугледжаныя па райбюджэце на скончэньне школы 7000 руб. не скарыстаны.

Старшыня сельсавету і загадчык ШКМ некалькі разоў ставілі перад РВК пытаньне аб тым, што яны самі наладзяць скончэньне школы, калі РВК перавядзе ім адпушчаныя па райбюджэце на скончэньне будынку грошы. Аднак, РВК не падтрымаў ініцыятыву сельсавету і загадчыка ШКМ, паставіўся да справы бюрократычна.

Такое становішча з будаўніцтвам, калі на вачох калгасьнікаў і аднаасобнікаў гніе будынак, на які затрачана ужо звыш 10000 руб., калі памяшканьня для школы зусім няма,—выклікае справядлівае абурэньне грамадзкасьці і патрабаваньне злайсьці і пакараць вінаватых, а будынак школы як мага хутчэй скончыць. Пра гэты ганебны факт пісалася ў газэтах, нават і справа была ў райпракурора, але да гэтага часу ніякіх вынікаў няма і за скончэньне будынку школы ніхто не бярэцца.

Караўлянскі райком партыі павінен пакласьці канец такой злачыннай агіднасьці. Украінская нацыянальная ШКМ павінна мець будынак, а вінаватыя ў безгаспадарчасьці павінны быць прыцягнуты да суровай адказнасьці.

П. ГАРБАЧОЎ.

**Ад рэдакцыі.** Рэдакцыя чакае ад Караўлянскага райкому партыі тэрмінова га паведамленьня аб ужытых захадах па сутнасьці гэтай карэспандэнцыі.

## Віцебск прыняў выклік асьветнікаў Менску

Віцебскі штаб па правядзеньні конкурсу на лепшую падрыхтоўку да навучальнага году абгаварыў на сваім пасяджэньні выклік Менскага гарана і саюзу працасьветы на сацспаборніцтва. Выклік прыняты і разгорнута праца па мабілізацыі пралетарскай грамадзкасьці на баявую сустрэчу «Дню вучобы».

Старшыня штабу ГЕНДЗІНА.

## Вопыт перадавікоў—ва ўсе сельсаветы

Засталіся лічаныя дні да пачатку зіняткаў. Аднак гэта ня турбуе раённыя ўстановы Сіроцінчыны.

Па раёне ў новым навучальным годзе павінна быць ахоплена школамі 1 канцэнтру 8500 дзяцей і II—1600, усяго 10000 чал. Адгэтуль вядзць, якія ад казныя задачы стаяць перад раённымі і сельскімі арганізацыямі.

На справе-ж Райпажыўсаюз і Райкалгасаюз яшчэ да сёнешняга дню па сваёй сетцы нічога ня робяць для таго, каб навучальны год сустрэць падрыхтаванымі. Гэтыя арганізацыі забылі аб тым, што школьнікаў трэба забясьпечыць гарачымі сьнеданьнямі, вопраткай і абуткам.

Скончэньне будаўніцтва Мішнявіцкай, Дабейскай і Спаскай ШКМ пад пагрозай зрыву. Распачатае будаўніцтва Бараньскай і Казьянскай ШКМ ідзе такімі тэмпамі, якія не забясьпечваюць скончэньня іх у тэрмін.

Надзвычайна марудна ідзе рамонт школ і прыстасаваньне кулацкіх дамоў пад школы, не клапоцяцца ў раёне аб арганізацыі рабочых пакояў пры школах і вырабе школьнай мэблі.

Шумілінская ШКМ дагэтуль яшчэ не распачала рамонт будынкаў і падрыхтоўку да навучальнага году.

Старшыня Мішкаўскага сельсавету т. Палканаў, склаўшы каштарыс на рамонт школ, кінуў яго у Райана, кажучы: «Як хочаце, так і рамантуйце, мне некалі, да і сродак такіх на бюджэце ў сельсавеце няма».

Ганебна плятуцца ў хвасьце па падрыхтоўцы да новага навучальнага году Жарабыцкі, Пагарэльцкі і Шумілінскі сельсаветы, якія сваёй бязьдзейнасьцю ставяць пад пагрозу зрыву своячасовы пачатак зіняткаў у школе.

Ёсьць па раёне і ўзоры прыкладнай барацьбы за баявую сустрэчу «Дню вучобы». Рад школ і сельсаветаў уключыліся ў конкурс. Ёсьць ужо і вынікі. Так, у школе «Серп і Молат», Спаскага сельсавету, настаўніца т. Грудзінская клапаціцца аб рамонце школьнага будынку і мабілізуе ўнутраныя рэсурсы: знайшла яна і цьвікі і патрэбны будматар'ял. Школа да пачатку заняткаў будзе гатова.

Загадчык Мішнявіцкай ШКМ т. Малахаў здабыў пэглы для рамонту школ усяго Мішнявіцкага сельсавету і ў май стэрні ШКМ наладзіў выраб абсталяваньня для школ усяго сельсавету.

Адстаючыя сельсаветы і школы павінны раўнацца па перадавікох і ўключыцца ў конкурс на лепшую падрыхтоўку да навучальнага году.

П. Харытановіч.

## ДРУКАРНЯ СТАЛІНА ЗАТРЫМЛІВАЕ ВЫПУСК ПАДРУЧНІКАЎ

### Становішча выданьня падручнікаў для беларускіх школ на 14-VIII

| | I канцэнтр | | II канцэнтр | |
|---|---|---|---|---|
| | На 4-VIII | На 14-VIII | На 4-VIII | На 14-VIII |
| Па пляне | 22 | 22 | 29 | 29 |
| Заказана | 22 | 22 | 30 | 30 |
| Выпла з друку | 8 | 8 | 1 | 1 |
| У друкарні | 4 | 5 | 6 | 7 |
| У тэхрэдакцыі | 2 | 2 | 1 | 2 |
| У галоўліце | — | 2 | 1 | — |
| У стылі | — | 2 | 2 | 4 |
| На аўтарск. праўцы | 1 | 2 | 1 | 1 |
| У рэцэнзэнтаў | 4 | — | 7 | 4 |
| У аўтароў (ня здана) | 1 | — | 7 | 7 |
| Вучпэдгіз (Масква) | — | — | 3 | 2 |
| У заг. сэктару | — | — | 1 | 1 |
| На перакладзе | 2 | 1 | — | 1 |
| Усяго | 22 | 22 | 30 | 30 |

**Хто затрымлівае:**

1. Пракапчук— Прыродазнаўства для VII г. павінен здаць 1-VIII.
2. Пэўзнэр—Грамадазнаўства для VII г. з 28 VII на аўтарскай праўцы.

Пост газ. „Сав. Бел."
пры ДВБ Лочмель,
Грышчук, Ляўданскі,
Тумілові.

## АПАВЯШЧЭНЬНІ

Культпроп Менгаркому КП(б)Б 16-га жніўня роўна а 12-ай гадзіне дня склікае нараду па падрыхтоўцы да новага навучальнага году з інфармацыяй з месц, на якую выклікаюцца:

1. Бранштэйн (Райсаюз).
2. Фрайнт (МГРК).
3. Грушнік (МРКС).
4. Некрашэвіч (ДВБ).
5. Турэцкі (Тр. грам. харчаваньня).
6. Ганчароў (Радыёцэнтр).
8. Садоўскі (Газэта «Рабочий»).
9. Джэлюк (Газэта «Зьвязда»).
10. Лебедзеў (Газэта «Калгас. Бел.»).
11. Шастакоў (Газэта «Савец. Бел.»).
12. Гнядзько (Гарпрафсавет).
13. Слуцкін (ГК ЛКСМБ).
14. Сідаровіч (Гаронаб).
15. Вярба (БКС).
16. Мелькік (рэд. «Актябр»).

Яўка абавязкова і без спазьненьня.

Менгарком КП(б)Б.

**Парткалегія ЦКК КП(б)Бел.** просіць Лябека Ільлю Хведарава (былой Любаньскай партарганізацыі, зьвяшча ў ПК, або паведаміць свой адрас ці месца працы.

Просьба да ўсіх арганізацый, якія ведаюць месца знаходжаньня памянёнага таварыша паведаміць у ПК.

Член ПК ЦКК КП(б)Бел. БІГЭ

**Парткалегія ЦКК КП(б)Бел.** паведамляе, што 20-VIII-32 г. у г. Петрыкаве будзе працаваць Выязная ПТ ЦКК КП(б)Б па разглядзе наступных зьяўляцьцяных спраў:

На 20-VIII-1932 году у г. Петрыкаве.

1. Блошан М. Петрыкаўскі раён.
2. Шкляр Петрыкаўскі раён.
3. Міронаў Л. Петрыкаўскі раён.
4. Бандарэнка Петрыкаўскі раён.
5. Махнюк А. Петрыкаўскі раён.
6. Шыло Р. Петрыкаўскі раён.
7. Шэўко С. Петрыкаўскі раён.
8. Мазай А. Петрыкаўскі раён.
9. Кузьміч Петрыкаўскі раён.
10. Лігорскі Я. Петрыкаўскі раён
11. Карас У. Петрыкаўскі раён.
12. Азем П. Петрыкаўскі раён.
13. Старобінец Петрыкаўскі раён.
14. Тышкевіч К. Петрыкаўскі раён
15. Равуцкі Петрыкаўскі раён
16. Дыбко Петрыкаўскі раён
17. Барабаш Я. Петрыкаўскі раён

Член ПК ЦКК КП(б)Бел. БІГЭ

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

## Пра падрыхтоўку кантынгэнтаў у школы ФЗВ у 1932 г.

### Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

Для забясьпечаньня гадавога прыёму ў школу фабрычна-заводзкага вучнёўства, вызначанага пастановай СНК СССР, Савет Народных Камісараў БССР **пастанаўляе:**

1. Устанавіць кантынгэнт падлеткаў, якія падрыхтоўваюцца на курсах дазавучэньня ў 1932 г. у 1000 чалавек.

2. Прапанаваць наступным гаспадарчым установам разгарнуць курсы дазавучэньня у разьмеры:
НК Легпром 300 чалавек.
НК Земляробства 250 чалавек.
НК Снабжэньня 50 чалавек.
Белкаапсаюз 200 чалавек.
Белкапрамсаюз 150 чалавек.
Белбудкантора Белжылсаюза 50 чалавек.

3. Вызначыць фінансаваньне курсаў дазавучэньня з сродкаў гаспадарчых арганізацый у суме 80 тыс. руб.

4. Прапанаваць народным камісарыятам і ўстановам неадкладна разгарнуць работу па правядзеньні курсаў дазавучэньня як праз арганізацыю самастойных курсаў, так і праз заключэньне дагавораў з НК Асьветы, перадаючы органам НК Асьветы і адпаведным сродкі на ўтрыманьне курсаў.

Заняткі на курсах пачаць не пазьней 10 жніўня г. г.

5. Пры камплектаваньні курсаў дазавучэньня у першую чаргу і лепшым складам падлеткаў павінны быць укамплектаваны курсы вядучых галін прамысловасьці.

6. На курсы дазавучэньня прымаць падлеткаў з абёмам ведаў ня ніжэй 3-х груп школ сацыяльнага выхаваньня.

7. Забараніць пасылку і прыём на курсы дазавучэньня падлеткаў, якія вучацца ў 7-годках.

8. Абавязаць НК Працы сыстэматычна правяраць ход разгортваньня курсаў дазавучэньня і заключэньня дагавораў паміж гаспадарчымі органамі і органамі НК Асьветы на падрыхтоўку падлеткаў у школы ФЗВ.

9. У зьвязку з дэфіцытам кантынгэнтаў для камплектаваньня ФЗВ, абавязаць Упаўнаважанага НК Цяжкай Прамысловасьці паставіць тэрмінова перад НК Цяжкай Прамысловасьці СССР пытаньне аб вылучэньні за лік кантынгэнтаў НК Цяжкай Прамысловасьці для дазавучэньня на цяжкай прамысловасьці БССР 700 дазавучнікаў з фінансаваньнем у 70 тыс. руб.

10. Абавязаць Упаўнаважаных саюзных народных камісарыятаў і цэнтральных установаў саюзнага падпарадкаваньня (Галоўдартранс, Трактарацэнтр і інш.) паставіць тэрмінова перад сваімі саюзнымі цэнтрамі пытаньне аб выдзяленьні кантынгэнтаў дазавучнікаў за лік саюзных кантынгэнтаў з адпаведным асьправаньнем за кошт саюзных сродкаў.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР
М. ГАЛАДЗЕД.

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР
Ф. СУЛКОЎСКІ.


ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"
Каса з 1 г. дня

Ад 14-жніўня новы савецкі фільм
„2 ЖАНЧЫНЫ 2"
Штодзённа 4 сэансы. Пачат. 6, 7-30, 9, 10-30.
Каса ад 4 гадз.

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"
Каса ад 12 гадз.

Ад 6 жніўня амэрыканская камэдыя
ХРЫЗАНТЭМА
Звыш праграмы кіно-хроніка Саюзкіно.



Васілевіцкая лесатэхнічная школа ЛЕСПРАМГАСВУЧУ
праводзіць
АСЕНЬНІ НАБОР СТУДЭНТАЎ
на лесаэксплёатацыйнае і лесакультурнае аддзяленьні, у колькасьці 200 асоб.

Школа рыхтуе высока-кваліфікаваных майстроў па лесаэксплёатацыі і лесакультурах.

Тэрмін навучаньня ў школе 2 гады.

Скончыўшыя ШКМ і ФЗС прымаюцца бяз іспытаў. Разам з гэтым будуць прымацца асобы з адукацыяй 6-ці і 5-ці груп і ва ўзросьце ад 16 да 19-ці год уключна.

Скончыўшым надаецца права карыстацца ўсімі правамі, якімі карыстаюцца школы ФЗВ. Школа павінна набраць ня менш 30 проц. жанчын ад усяго набору.

Студэнты забясьпечваюцца стыпэндыяй на 100 проц. у разьмеры ад 24 да 70 руб. у месяц (у залежнасьці ад курсу і пасьпяховасьці).

Пры школе ёсьць інтэрнат, сталоўка, лазьня і пральня.

Для паступленьня ў школу неабходна падаць наступныя дакументы (у арыгінал): 1) аб адукацыі, 2) аб узросьце, 3) аб стане здароўя, 4) аб сацстановішчы бацькоў, або паступаючага ў сучасны момант, 5) анкета, засьведчаная мясцовымі органамі і 6) паштовых марак на 35 кап.

Тэрмін падачы заяў да 1 верасьня 1932 году.

Адрас школы: Ст. Васілевічы, Заходняй чыгункі, вучэбны гарадок, школа ЛЕСПРАМГАСВУЧУ.

Дырэкцыя школы.


## АБАВЯЗКОВАЯ ПАСТАНОВА № 66

### Менскага Гарадзкога Савету Рабоча-Сялянскіх і Чырвонаармейскіх дэпутатаў

14 жніўня 1932 г. гор. Менск.

У мэтах палепшаньня ўліку руху насельніцтва па тэрыторыі сельсаветаў, уваходзячых у межы Менскага Гарадзкога Савету, Менскі Гарадзкі Савет Рабоча-Сялянскіх і Чырвонаармейскіх дэпутатаў ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Абавязаць усіх грамадзян, прыбываючых на тэрыторыі: Астрашыцка-Гарадзецкага, Калодзішчанскага, Гамярнянскага, Баруўскога, Апчацкага, Заматоцкага, Трасьцянецкага, Навадворскага, Каралішчанскага, Грычынскага, Кайкаўскага, Падгайскага, Гатаўскага, Крупіцкага і прыгараднага сельсаветаў на стале і часовае жыхарства, у камандыроўкі, на розную роду работу і па іншых справах, на працягу 24 гадзін з часу прыбыцьця зарэгістравацца ў тым сельсавеце, на тэрыторыю якога асоба прыбыла, а пры выбыцьці зьнікда з вучоту ў тым-жа сельсавеце.

2. Сталыя жыхары сельсаветаў і асобы прыбыўшыя да выданьня гэтай абавязковай пастановы рэгістрацыі не падлягаюць.

УВАГА. Асобы, якія зьяўляюцца сталымі жыхарамі сельсавету, але прабыўшыя ў адлучцы больш шасьці месяцаў, пры звароце ў межы сельсавету падлягаюць рэгістрацыі.

3. Абавязаць дамакіраўніцтвы, дамаўласьнікаў і кватаранаймальнікаў сачыць за тым, каб кожная асоба, якая застанавілася на жыхарства, была зарэгістравана ў сельсавеце ў паказаны ў п. 1 гэтай пастановы тэрмін.

4. Абавязаць загадчыкаў устаноў, прадпрыемстваў і кіраўнікоў розных сэзонных работ, разьмешчаных на тэрыторыі сельсаветаў пералічаных у п. 1 гэтай пастановы, сачыць за тым, каб кожная паступаючая на работу асоба, якая прыбыла з замежаў паказаных сельсаветаў, была зарэгістравана ў сельсавеце.

5. Прыбыўшыя на тэрыторыю сельсаветаў асобы павінны пражываць па тым адрасе, які імі будзе паказаны ў рэгістрацыі, а ў выпадку яго зьмены павінны паведаміць таму сельсавету, у якім яны зарэгістраваны.

6. Нагляд за выкананьнем гэтай абавязковай пастановы ўкладзецца на сельсаветы, сельвыканаўцаў і міліцыю.

7. Асобы, вінаватыя ў парушэньні гэтай абавязковай пастановы, падлягаюць адказнасьці ў адміністрацыйным парадку штрафу да 100 руб. або прымусовай працы да 15 дзён.

8. Гэтая абавязковая пастанова ўваходзіць у моц з дню яе апублікаваньня.

Нам. старш. Гарсавету КАРАНЕЎСКІ

Сакратар Менгарсавету ЛЮЦЬКО


Беларускі дзяржаўны водна-мэліярацыйны Інстытут
абвяшчае
АСЕНЬНІ НАБОР на 1-шы курс

АДДЗЯЛЕНЬНЯЎ: 1) асушэньня і рэгуляваньня рэк, 2) водазабясьпечаньня (водаправод і каналізацыя) з кантынгентам прыёму — 150 чал.

Тэрмін навучаньня 4 гады

Інстытут выпускае інжынэраў-гідратэхнікаў па асушэньні зямель і рэгуляваньні рэк, інжынэраў-будаўнікоў па водаправодзе і каналізацыі.

Прынятыя ў інстытут забясьпечваюцца стыпэндыяй у залежнасьці ад пасьпяховасьці ад 85 да 190 руб., атрымоўваючыя стыпэндыю забясьпечваюцца інтэрнатам.

Прымаюцца асобы ва ўзросьце ад 18 да 35 год.

Без іспытаў прымаюцца толькі скончыўшыя рабфакі у 1932 г., а ўсе астатнія асобы павінны трымаць іспыты.

Іспыты будуць утвараца з 10-IX па 20-IX 1932 г. Заняткі адкрыюцца з 1-X 1932 году.

Тэрмін падачы заяў з 1-VII па 10-IX 1932 году.

Да заяў прыкладаюцца дакументы згодна даведніка Наркамасьветы БССР. Заявы і дакументы ў арыгіналах накіроўваць на адрас:

Беларускія Горкі, Водна-мэліярацыйны інстытут.

Пры інстытуце маецца завочны сэктар па падрыхтоўцы спэцыялістаў гідратэхнікаў у аб'ёме ВНУ і брыгадзіраў па спэцыяльнасьці асушэньня зямель і рэгуляваньня рэк і водазабясьпечаньня.

Прыём заяў на завочны сэктар утварэнцы на працягу ўсяго году.

Умовы і парадак прыёму на завочны сэктар вызначаны ў праспэкце Беларускага рэспубліканскага інстытуту завочнай падрыхтоўкі.

Заявы і дакументы прысылаюцца на той-жа адрас на імя завочнага сэктару

ДЫРЭКЦЫЯ.



Згублены гадавы праязны білет прыгародных зносін Рудзенск—Калодзішчы, выданы Менскім вузлом МБВ чыг. на імя ШЫЛАЙ Уладзімера Андрэева, лічыць несапраўдным

Згублена велёабязацельства сэр. З, выд. Койданаўскай ашчадкасай гр. Шатэрніку П. П., лічыць страціўшым моц



„ІСКРЫ ІЛЬЛІЧА"—
У ДЗІЦЯЧЫЯ МАСЫ